

ШТО ПАЧЫМ НА КІРМАШЫ? 7



ЯК ЗМЕНІЦЦА ЗАКАНАДАЎСТВА АБ ГВАЛЦЕ Ў СЯМ'І? 7


17 ЛІСТАПАДА 2021 г.
СЕРАДА
№ 222 (29591)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА


З першых вуснаў

## «ГАЛОЎНАЕ — АБАРАНІЦЬ СВАЮ КРАІНУ І СВОЙ НАРОД, НЕ ДАПУСЦІЦЬ СУТЫКНЕННЯЎ»

### Прэзідэнт правёў нараду па сітуацыі на граніцы

**У размове з чыноўнікамі Аляксандр Лукашэнка засяродзіў увагу на небяспечнасці мігранцкага крызісу для Беларусі і расказаў пра сутнасць размовы з канцлерам Германіі Ангелай Меркель, якая адбылася напярэдадні вечарам. Па яго словах, суразмоўцы прыйшлі да адзінага меркавання, што эскалацыя канфлікту на граніцы не патрэбная ні Еўрапейскаму саюзу, ні Беларусі. Аляксандр Лукашэнка агучыў нямецкаму палітыку сваю прапанову па развязцы сітуацыі. Ангела Меркель папрасіла час, каб абмеркаваць яе з Еўрапейскім саюзам.**



Фота БелТА.

Забеспячэнне бяспекі дзяржаўнай граніцы — найважнейшая праблема, якая абумоўлена ўзрослым патокам бежанцаў на тэрыторыю Беларусі, сказаў Аляксандр Лукашэнка. На граніцах суседзяў, перш за ўсё Польшчы, знаходзяцца не толькі пагранічнікі, — там нарошчваецца ўдарная групоўка войскаў да 20 тысяч асабовага складу з авіяцыяй і бронетэхнікай.

***«Усё гэта робіцца пад выглядам абароны Еўрапейскага саюза ад уварвання бежанцаў з краін, якія разбамбіла і разрабавала заходняя кааліцыя на чале са Злучанымі Штатамі Амерыкі. Я толькі не разумею*** (правільна адзначаюць сродкі масавай інфармацыі), ***навошта супраць бежанцаў самалёты, верталёты і танкі?»*** — заўважае Прэзідэнт.

Яго ўражвае рэакцыя польскіх палітыкаў і чыноўнікаў Еўрапейскага саюза: замест пошуку сумесна з беларускім бокам рашэнняў Еўрасаюз згортвае праекты трансгранічнага супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння.

«Акрамя таго, пагражаюць новым пакетам санкцый і будаўніцтвам аж пяціметровай сцяны, падумваюць аб поўным закрыцці граніц з Беларуссю. Калі ласка, калі больш няма чым займацца, мы не пярэчым», — адзначае кіраўнік краіны.

Ён нагадаў, што раней на нарадзе з урадам ставіў задачу па забеспячэнні мігрантаў, якія аказаліся на нашай тэрыторыі, самым неабходным.

***«Мы не закрываем рот журналістам. Любы прадстаўнік прэсы, беларускай і замежнай, можа прыехаць і весці рэпартаж з любога пункта дзяржаўнай граніцы. Нам зараз галоўнае абараніць сваю краіну і свой народ, не дапусціць сутыкненняў»***, — падкрэслівае Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, спробы дастаўкі зброі ў стыхійны мігранцкі лагер ужо былі, як і правакацыі, якія могуць прывесці да сілавога канфлікту. «Гэтага дапусціць ні ў якім разе нельга. Нельга, каб гэтая праблема стала развязваннем гарачага супрацьстаяння», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

#### Дапусціць эскалацыю не можам

Перад абмеркаваннем дакладаў Прэзідэнт расказаў прысутным на нарадзе пра кантакты па мігранцкай праблеме з Еўрапейскім саюзам. Кіраўнік краіны нагадаў, што міністр замежных спраў Уладзімір Макей падтрымлівае сувязь з Жазэпам Барэлем, вярхоўным прадстаўніком ЕС па замежных справах і палітыцы бяспекі. Да гэтага былі перагаворы на ўзроўні іх намеснікаў. А пазаўчора Прэзідэнт Беларусі асабіста правёў тэлефонную размову з канцлерам Германіі Ангелай Меркель.

«Якія пытанні абмяркоўваліся? Першае — бежанцы, эскалацыя на дзяржаўнай граніцы. ***Мы прыйшлі да адзінага меркавання, што эскалацыя нікому не патрэбная — ні Еўрапейскаму саюзу, ні Беларусі.*** Дапусціць эскалацыі, як бы камусьці гэтага ні хацелася, як я казаў, амаль да гарачага сутыкнення, мы не можам», — адзначае Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго, Беларусь ніколі не імкнулася да такога, не разгарнула на граніцы ніводнага ўзвода ваенных. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што планы супрацьдзеяння любой агрэсіі ёсць. Адпаведная каманда дадзена міністру абароны і іншым генералам сілавых структур.

Другое пытанне, якое абмяркоўвалі падчас тэлефоннай размовы з нямецкім палітыкам, — прыток бежанцаў. Прэзідэнт адзначае, што погляды па гэтай тэме ў ЕС і Беларусі розныя.

«Яны вельмі азадачаны прытокам бежанцаў у Беларусь. Але яны абсалютна не ведаюць, што не мы іх сюды клічам. І не ведаюць, што каля 5 тысяч на сёння (два дні таму было 4681) чалавек мы за восень вярнулі назад. То-бок ***мы не збіраем па ўсім свеце бежанцаў і не прывозім у Беларусь, як Польшча праінфармавала Еўрапейскі саюз.*** Тых, хто законна прыязджае ў Беларусь, тут прымаем. У каго хоць маленькае парушэнне закона — у самалёт і назад», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

Асноўная праблема, дадаў Прэзідэнт, на абмеркаванні якой ён асабліва настойваў у перагаворах з Меркель, — лагер бежанцаў з 2100 чалавек на пагранпераходзе «Брузгі». Складанасць, паводле слоў Прэзідэнта, у наступным: калі палітыкі не выратуюць гэтых людзей, і Беларусь, і ЕС «будуць бітыя».

«З гэтымі людзьмі неабходна тэрмінова нешта вырашаць. У сувязі з гэтым я ўнёс прапанову ў цэлым па развязцы сітуацыі. Не буду яе зараз канкрэтызаваць. Мы дамовіліся з Меркель, што мы не будзем пакуль пра гэта казаць канкрэтна. Яна папрасіла час, каб абмеркаваць гэту прапанову з Еўрапейскім саюзам», — паведаміў кіраўнік краіны.

Яшчэ адно пытанне — даступнасць гуманітарнай дапамогі для бежанцаў. Як расказаў Прэзідэнт, Польшча ўвяла ў зман Еўрасаюз, што Беларусь блакіруе пастаўкі.

СТАР. 2

# НАЙПЕРШ — ЛЮДЗІ



Фота БелТА.

*Учора ў календары значыўся Міжнародны дзень талерантнасці. Дата 16 лістапада была названая такім днём на самым высокім узроўні — на Генеральнай Асамблеі структуры ААН ЮНЕСКА. Менавіта ўчора больш чым калі варта было памятаць аб «павазе, прыняцці і правільным разуменні багатай разнастайнасці культур нашага свету», аб тым, што «людзі, якія адрозніваюцца па знешнім выглядзе, становішчы, мове, паводзінах і каштоўнасцях, маюць права жыць у міры і захоўваць сваю індывідуальнасць»...*

*Аб тым, як разумеюць талерантнасць у Польшчы, учора было відаць вельмі добра. На непадобных на іх колерам вачэй і скуры жанчын і дзяцей узброеныя людзі распылялі газ і лілі падфарбаваную хіміяй ваду з вадамётаў...*

*Як кантраст — ды нават не кантраст, а проста праява чалавечнасці ці, калі хочаце, той самай талерантнасці — даручэнне, якое даў кіраўніцтву Гродзенскай вобласці Прэзідэнт. Арганізаваць начлег для жанчын і дзяцей, якія знаходзяцца на граніцы. Для іх падрыхтавалі лагістычны цэнтр, што знаходзіцца непадалёк. Сяргей Новікаў, намеснік старшыні Дзяржпагранкамітэта, ужо непасрэдна на месцы запэўніў, што ў падрыхтаваным памяшканні можна пагрэцца, паесці і адпачыць. «Бежанцы — найперш людзі. А для людзей неабходна ствараць прымальныя ўмовы для іх размяшчэння», — сказаў ён такія зразумелыя ўсім беларусам словы.*

*А знясіленыя людзі не хацелі сыходзіць ад граніцы, хоць у лагістычным цэнтры маглі змясціцца ўсе. Як расказаў журналістам памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці Юрый Караеў, многіх з іх давялося проста ўгаворваць пайсці на ноч у цяпло, пакінуць граніцу. «Яны былі поўныя рашучасці знаходзіцца там. Мы патлумачылі ім, прасілі: заканчвайце мучаць сябе, хоць ноч правядзіце ў цяпле».*

*Да лагістычнага цэнтра пад'ехалі ваенныя палявыя кухні, каб як мінімум раз у суткі пакарміць людзей гарачым. Каля лагістычнага цэнтра ўстанавілі біятуалеты, паставілі палатку для абагравання, прывезлі генератар — каб было цёпла і светла...*

*А хіба можна інакш? Калі мы яшчэ хочам звацца людзьмі...*

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Сусветная харчовая праграма ААН заклікала мільярдэраў ахвяраваць больш за $6 млрд на барацьбу з голадам

**Сусветная харчовая праграма ААН прадставіла план па барацьбе з голадам, у якім прадэманстравала, як інвестыцыі ў памеры $6,6 млрд могуць выратаваць 42 млн чалавек у 43 краінах.**



У кастрычніку Дэвід Бізлі заклікаў мільярдэраў, такіх як Ілан Маск і заснавальнік карпарацыі Amazon Джэф Безас, укласці $6 млрд у барацьбу з голадам. У адказ на гэта Ілан Маск у запісе ў Twitter дапусціў, што зможа ахвяраваць арганізацыі гэтую суму, калі будзе ведаць, на якія канкрэтна мэты яна пойдзе. Пры гэтым ён падкрэсліў, што справаздачнасць павінна весціся ў адкрытых крыніцах, каб людзі бачылі, якім менавіта чынам размяркоўваюцца сродкі.

«Гэты харчовы крызіс з'яўляецца беспрэцэдэнтным, але яго можна пазбегнуць. Ілан Маск, вы прасілі аб канкрэтным плане і поўнай празрыстасці. Вось ён. Мы гатовы размаўляць з вамі і ўсімі тымі, хто сур'ёзна настроены на выратаванне жыццяў. Для прадухілення голаду ў 2022 годзе патрабуецца $6,6 млрд», — напісаў Дэвід Бізлі ў Twitter, прымацаваўшы спасылку на падрыхтаваны ВПП план.

### ЦВК Лівіі адмовілася дапусціць на выбары сына Муамара Кадафі

ISSN 1990 - 763X

**Вярхоўная выбарчая камісія Лівіі адмовілася дапусціць да ўдзелу ў прэзідэнцкіх выбарах сына Муамара Кадафі Сейф аль-Іслама Кадафі і адхіліла яго заяўку, паведамляе РІА «Навіны».**

У выбаркаме спасылаліся на «расхістванне стабільнасці» і ўказалі, што адхілілі кандыдатуру сына былога дыктатара. Раней стала вядома, што сын былога лівійскага лідара захацеў узначаліць краіну. Дакумент ён прадставіў у рэгіянальную выбарчую камісію ў горадзе Себха на поўдні Лівіі.

Сейф аль-Іслам Кадафі нарадзіўся ў 1972 годзе. Вучыўся ў Швейцарыі і Вялікабрытаніі, дзе скончыў Лонданскую школу эканомікі і палітычных навук. У гады кіравання бацькі ён займаўся сувязямі Лівіі з заходнімі краінамі. Пасля звяржэння Муамара Кадафі кароткі час узначальваў супраціўленне, аднак у канцы 2011 года быў захоплены і паўстаў перад судом. У 2017 годзе быў вызвалены дзякуючы абвешчанай урадам Лівіі амністыі.

### Экс-кіраўнік МУС Украіны Авакаў: у Зяленскага на выбарах выйграе хто заўгодна

**Прэзідэнта Украіны Уладзіміра Зяленскага на будучых выбарах змогуць абыграць любыя кандыдаты. Такое меркаванне выказаў экс-кіраўнік МУС Украіны Арсен Авакаў у інтэрв'ю «Украинской правде».**

«Каму заўгодна хопіць сіл выйграць у Зяленскага. На яго полі з'явіўся экс-спікер Рады Дзмітрый Разумкоў. Цяпер яны яго выганяць з парламента — і ён атрымае яшчэ 5 %. Потым з'явіцца, напрыклад, Дзмітрый Гардон ці доктар Камароўскі. Гэта таксама на тым жа полі», — патлумачыў сваю пазіцыю Авакаў.

У гэтым жа інтэрв'ю былы кіраўнік украінскага МУС адзначыў, што ў Зяленскага фарміруецца антырэйтынг, які «непазбежны» ў любога, хто кіруе Украінай у бягучай сітуацыі. Прэзідэнт, на яго думку, «трапіў у вар'яцкую пастку» і становіцца аўтарытарным з-за знікнення «балансу» ў выніку атрымання «манабольшасці» на парламенцкіх выбарах. Пры гэтым, падкрэсліў Авакаў, прэзідэнт фактычна «траціць рэйтынг» на «інтрыгі, а не на стварэнне».

Улетку гэтага года Авакаў пакінуў пасаду міністра ўнутраных спраў Украіны, як ён сам указаў, з-за таго, што не хацеў прымаць удзел у «некаторых рэчах, з якімі не згодны».

## КОРАТКА

- **У Мінскай вобласці плануюць узвесці 17 малочнатаварных ферм у 2022 годзе.**
- У Магілёве аддзяленні аблбальніцы і шпіталя інвалідаў вайны прымаюць пацыентаў па профілі.
- **У Беларусі «прапампавалі» мабільны 4G-інтэрнэт у 44 населеных пунктах.**
- Ozon і «Белпошта» плануюць пашырыць супрацоўніцтва.
- **У Мінску зімой абсталююць 14 лыжных трас і 25 лядовых каткоў.**
- У Брэсце высадзяць больш за 30 тысяч цюльпанаў.
- **У Мінску на вул. Кальварыйскай за раніцу 16 лістапада адбылося больш як 10 ДТЗ.**
- У пазаконкурснай праграме «Лістапада» пакажуць дакументальны фільм Олівера Стоўна «Qazaq. Гісторыя залатога чалавека».

Здароўе

## «КАМБУСТЫЯЛОГІЯ ПАТРАБУЕ ТРАПЯТКОГА СТАЎЛЕННЯ ДА ПАЦЫЕНТА, ДА КОЖНАГА САНТЫМЕТРА ЯГО СКУРЫ»

**За ходам лячэння Ромы Кагадоўскага, 12-гадовага хлопчыка, які вынес з ахопленага полымем дома на руках свайго двухгадовага брата, некалькі месяцаў сачыла амаль уся краіна. Менавіта тады многія беларусы даведаліся аб існаванні Рэспубліканскага апёкавага цэнтра і пачулі пра такіх урачоў, як камбустыёлагі. Падрабязней пра дзейнасць камбустыялагічнай службы Беларусі, унікальнасць сваёй прафесіі (у краіне толькі 50 такіх спецыялістаў) і мару айчынных камбустыёлагаў расказаў дэкан хірургічнага факультэта Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі (БелМАПА), галоўны пазаштатны камбустыёлаг Міністэрства аховы здароўя, кіраўнік Рэспубліканскага апёкавага цэнтра, кандыдат медыцынскіх навук Аляксей ЧАСНОЙЦЬ.**



***— Нямногія ведаюць пра такую галіну медыцыны, як камбустыялогія. Раскажыце, чым займаюцца ўрачы-камбустыёлагі?***

— Вы маеце рацыю, як самастойная спецыяльнасць камбустыялогія — навука аб лячэнні апёкаў — нарадзілася ў маштабах хірургіі зусім нядаўна. Падставай для гэтага сталі наступствы атамных бамбардзіровак Хірасімы і Нагасакі ў жніўні 1945 года.

СТАР. 8

# «ГАЛОЎНАЕ — АБАРАНІЦЬ СВАЮ КРАІНУ І СВОЙ НАРОД, НЕ ДАПУСЦІЦЬ СУТЫКНЕННЯЎ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Польшча быццам бы хацела, але яе не пускаюць. На гэта я заўважыў: якія праблемы могуць быць у палякаў, каб перадаць гуманітарную дапамогу? Калі ласка, прывозьце да граніцы, аддавайце праз калючы дрот, што вы будавалі. Калі хочаце прыбраць калючы дрот, мы не супраць. Прыбірайце, пад'язджайце да бежанцаў. Гэта проста хлусня, фэйк, каб больш нацкаваць Еўрапейскі саюз і насельніцтва ЕС супраць Беларусі», — адказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён абверг інфармацыю пра тое, што да мігрантаў не пускалі прадстаўнікоў Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў. Прадстаўнік прыязджаў у лагер, размаўляў з мігрантамі, інфармацыя была ў СМІ і інтэрнэце.

***«Ідзе хлусня і нагнятанне антыбеларускай істэрыі перш за ўсё Польшчай, Літвой, Латвіяй.*** І Украіна, на жаль, да гэтага падключылася, наколькі я мог адчуць гэта з 50-хвіліннай размовы з канцлерам Германіі», — дадаў Прэзідэнт.

Ён дамовіўся быць у пастаянным кантакце з Германіяй да вырашэння праблемы з бежанцамі. І ў найбліжэйшы час адбудзецца яшчэ адзін раўнд перагавораў па пытанні. Зараз Прэзідэнт чакае ад ЕС адказ на яго прапанову па выхадзе з крызісу, якую ён агучыў Ангеле Меркель.

### «З гэтым рэжымам вам прыйдзецца мець справу»

Прэзідэнт акцэнтаваў увагу, што дапамога бежанцам будзе працягвацца да развязкі праблемы. «Я думаю, яна ў найбліжэйшы час будзе. ***Да нас не можа быць ніякіх прэтэнзій. Мы робім усё, каб абараніць гэтых людзей. Самае небяспечнае — гэта спроба падкінуць у гэты лагер зброю. Зацікаўленасць, каб хтосьці стрэліў у той бок, велізарная. Адзін стрэл — і гарачае супрацьстаянне непазбежнае. Мы адцягваем каласальныя сілы, каб гэта папярэдзіць»***, — мяркуе Аляксандр Лукашэнка.

Па словах Прэзідэнта, штодня з Беларусі на тэрыторыю Польшчы, Літвы, Латвіі па інфармацыі з іх крыніц пранікае больш за 660—700 чалавек. Гэтых людзей вылоўліваюць, збіваюць і перамяшчаюць на дзяржаўную граніцу, паведаміў кіраўнік краіны.

«У нас такіх людзей 330 чалавек акрамя гэтага лагера. Яны знаходзяцца паміж дзвюма агароджамі: нашы інжынерныя збудаванні, што засталіся з савецкіх часоў, і той плот, што яны выбудавалі. Вось яны там і матляюцца на лініях дзяржаўнай граніцы, пакуль зноў не праб'юцца праз калючы дрот і не пройдуць на тэрыторыю Польшчы», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў, што ўсе хочуць завяршэння гісторыі. Не зацікаўлены ў гэтым толькі збеглыя прадстаўнікі апазіцыі, якія абурыліся яго перагаворам з Ангелай Меркель.

«Яны бедную гэту жанчыну, канцлера Германіі, спаласавалі ўздоўж і ўпоперак: «І такая, і сякая. І качка кульгавая, і навошта табе было з гэтым дыктатарам размаўляць?» І пайшло і паехала! Устае пытанне: мы людзей абараняем і гатовы скарыстацца любой дапамогай ці ў іх пытанне — рэжым Лукашэнкі? Так, рэжым Лукашэнкі, і з гэтым рэжымам вам давядзецца мець справу, спадары «опы», калі вы хочаце», — дадаў Прэзідэнт.

### «Гатовы выкарыстаць дапамогу з боку любой дзяржавы»

Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу, што ёсць многа бакоў, якія гатовы зрабіць унёсак дзеля ўрэгулявання сітуацыі з бежанцамі. Да іх кіраўнік краіны адносіць Аб'яднаныя Арабскія Эміраты. Кіраўніцтва гэтай краіны, на яго думку, мае вялікі вопыт работы з бежанцамі, ужо прымала ўдзел у развязцы падобных пытанняў у свеце і працавала з тысячамі бежанцаў.

«Мы пастаянна знаходзімся з імі ў кантакце, наколькі я разумею. Яны гатовыя падставіць плячо. Мы сёння гатовы выкарыстаць любое мерапрыемства, рух і дапамогу з боку любой дзяржавы. Тым больш з боку сяброўскай нам дзяржавы, як ААЭ. У найбліжэйшы час планую з кіраўніцтвам Эміратаў перагаварыць, каб яны падключыліся да вырашэння гэтай праблемы», — кажа Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначае, што плануе размову і з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным. Пры неабходнасці папросіць аказаць ваенна-тэхнічную дапамогу, не ўцягваючы Расію ў гэты крызіс.

«Вы ж бачыце, тады ўсю адказнасць калектыўны Захад перакідвае на Расію, якая пакуль да гэтага не мае ніякіх адносін», — заўважыў кіраўнік краіны.

**Марыя ДАДАЛКА.**

**Размова па тэлефоне паміж прэзідэнтамі адбылася пасля нарады. Як перадае прэс-служба кіраўніка краіны, лідары перш за ўсё абмеркавалі сітуацыю на беларуска-польскай граніцы і сумесныя дзеянні па абароне граніц Саюзнай дзяржавы. Яшчэ адной тэмай размовы стала сітуацыя ва Украіне і пазапланавыя вучэнні Украіны і ЗША каля граніц Расійскай Федэрацыі і ў Чорным моры. Прэзідэнт Расіі праінфармаваў беларускага калегу аб сітуацыі ў Чорным моры ў цэлым. Прэзідэнт Беларусі ў сваю чаргу праінфармаваў кіраўніка расійскай дзяржавы аб тэлефоннай размове, якая адбылася напярэдадні з в.а. канцлера Германіі Ангелай Меркель. Абмеркавалі Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін таксама графік будучых кантактаў.**

## ❍ Каментарый у тэму

**Наталля КАЧАНАВА, спікер Савета Рэспублікі,** расказала журналістам, што ўсе грамадскія арганізацыі, дзяржаўныя органы падключыліся да аказання гуманітарнай дапамогі бежанцам.

«Каля 40 тон гуманітарнай дапамогі раздалі бежанцам. Для іх былі арганізаваны палаткі, дзе іх кармілі, абагравалі. Калі яны знаходзяцца на граніцы з Польшчай, там гэтага няма. Але мы гатовы працягваць аказанне гуманітарнай дапамогі. У нас у запасе ёсць 10 тон гуманітарнай дапамогі», — канкрэтызуе спікер верхняй палаты.

Па яе словах, пастаянна аказваецца мігрантам медыцынская дапамога, каля 60 чалавек звярнулася ва ўстановы аховы здароўя.

«Не спынялася аказанне гуманітарнай дапамогі беларускім бокам. Я магу ўсіх запэўніць: мы будзем гэта рабіць, нягледзячы ні на што. Гэтыя людзі апынуліся ў няпростых умовах, і беларускі бок зробіць усё, каб людзей абагрэць і накарміць пры іх жаданні», — кажа Наталля Качанава.

**Віктар ХРЭНІН, міністр абароны**, паведаміў, што ваенныя Беларусі адсочваюць усе рухі войскаў у сумежных краінах. Для гэтага нарасцілі ўсе віды разведкі, і міністэрства дакладна бачыць, што адбываецца на тэрыторыі краін Балтыі і Польшчы.

«Сёння мы бачым, што ў прыгранічнай тэрыторыі створана групоўка ваеннаслужачых — каля 23 тысяч, якія выконваюць задачы па барацьбе з мігрантамі. Для іх размяшчэння на тэрыторыі Польшчы створана каля 13 лагераў. Лічым гэта выклікамі і пагрозамі», — кажа міністр абароны.

Ён заўважае, што польскае ваеннае ведамства не дае адказаў на запыты аб сутнасці гэтых мерапрыемстваў. Па словах міністра абароны, нашы суседзі такім чынам спрабуюць атрымаць палітычныя, эканамічныя бонусы, а магчыма, і ўвесь ЕС уцягнуць у праблему, што існуе на граніцы.

«Польскі бок не ідзе на кантакты. Мы накіроўвалі ім запыт правесці кансультацыі. Да гэтага часу няма адказу», — сцвярджае Віктар Хрэнін.

**Анатоль ЛАПО, старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта**, назваў абстаноўку на граніцы кантралюемай.

«Зразумела, ёсць напружанне на брузгоўскім напрамку. Больш за дзве тысячы чалавек апынулася на граніцы. Такога яшчэ ніколі не было. Увесь асабовы склад перабудоўваецца, нясе службу ў штатным рэжыме. Не хаваем, ёсць нагрузка, але ўсе мы пагранічнікі, людзі ваенныя, служым і вытрымліваем нагрузку», — выказаўся Анатоль Лапо.

Акцэнты

# МІЛАСЭРНАСЦЬ, ЧАЛАВЕЧНАСЦЬ, ДАБРЫНЯ

## Агульначалавечыя каштоўнасці не залежаць ад нацыянальнасці

**По ўсёй краіне прайшлі акцыі па зборы гуманітарнай дапамогі для бежанцаў, якія вымушаны пакутаваць на беларуска-польскай граніцы.**



Фота Рамана КЛЮЧЫНА.

Наталля КАЧАНАВА:

### «Бежанцам раздалі 40 тон прадуктаў, на складах чакаюць яшчэ 10 тон»

**Старшыня Савета Рэспублікі, якая па даручэнні Прэзідэнта каардынуе гуманітарную місію для тых, хто сёння па волі лёсу захрас на лініі беларуска-польскай граніцы, расказала аб тым, што для іх зроблена і на якую дапамогу яны могуць разлічваць.**

— Сітуацыя, якая складваецца на беларуска-польскай граніцы і разгортваецца вакол нашай краіны, не можа не хваляваць ніводнага нармальнага разважнага чалавека ў нашай краіне, — пераканана Наталля Качанава.

Яна адзначыла, што Савет Рэспублікі вельмі шчыльна падключыўся да пытанняў аказання гуманітарнай дапамогі бежанцам, якія апынуліся ў няпростай сітуацыі.

— Шчыра вам скажу, я не магу спакойна і раўнадушна глядзець, калі ўключаю навіны, таму што жанчыны і дзеці — самае святое і дарагое, што можа быць у кожнага чалавека. І калі ты ўяўляеш, у якіх нечалавечых умовах знаходзяцца сёння дзеці, якія па волі лёсу апынуліся ў такой сітуацыі, становіцца жудасна і жахліва, — эмацыянальна выказалася спікер верхняй палаты парламента падчас сустрэчы з актывам Маладзёжнага савета (парламента).

Паводле яе слоў, літаральна ўсе грамадскія і дзяржаўныя арганізацыі краіны адгукнуліся і ўключыліся ў працэс збору і аказання дапамогі бежанцам:

— Каля 40 тон прадуктаў харчавання было накіравана для гэтых людзей, каб забяспечыць іх ежай. Сёння раніцай (16 лістапада. — **Аўт.**) раздавалі пакункі з прадуктамі, на складах яшчэ знаходзяцца 10 тон, якія мы гатовы аддаць, каб накарміць гэтых людзей, — расказала Наталля Качанава.

Акрамя таго, аказваецца медыцынская дапамога тым, хто мае ў ёй патрэбу.

— За гэты месяц каля 60 чалавек звярнуліся па медыцынскую дапамогу, — патлумачыла яна і дадала, што гаворка ідзе не толькі за апошні тыдзень, калі людзей значна прыбавілася, а з надыходам халадоў і зваротаў з боку людзей, якія пакутуюць на граніцы.

Яна звярнула ўвагу на бязглуздасць абвінавачанняў нашай краіны і блакіраванні гуманітарнай дапамогі:

— Гэта проста за межамі разумення! Настолькі выдумана, высмактана з пальца, абсалютна непраамерна, — выказала абурэнне Наталля Качанава.

Спікер запэўніла, што ўся неабходная дапамога, якая датычыцца абагрэву і дастаўкі прадуктаў людзям, аказваецца ў поўным аб'ёме:

— Гэта тое, чым мы займаемся ўсе разам, — падкрэсліла яна.

Наталля Качанава падзякавала ўсім, хто нераўнадушны да бяды бежанцаў, якія заселі на граніцы, і адносіцца да іх сітуацыі са спачуваннем і паразуменнем.

— Таму што гэта людзі і мы не можам адносіцца да іх па-іншаму, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі.

### Удзел неабыякавых

**У Беларускім таварыстве Чырвонага Крыжа адбылася перадача гуманітарнай дапамогі для мігрантаў, якія апынуліся ў цяжкай сітуацыі на беларуска-польскай граніцы.**

У арганізацыі набыцця і перадачы гуманітарнай дапамогі прынялі ўдзел раённыя арганізацыі Мінскай гарадской арганізацыі Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь».

— Мы ўсе спачуваем і перажываем за людзей, якія засталіся без прытулку, ежы, элементарных санітарных умоў, — кажа **выконваючая абавязкі старшыні Мінскай гарадской арганізацыі РГА «Белая Русь» Людміла ШЫПАЙ.** — Самае галоўнае для бежанцаў, якія сёння знаходзяцца на холадзе, — гэта ежа. Таму Мінская гарадская арганізацыя са сваімі структурамі сапраўды гэтак жа, як і многія неабыякавыя грамадзяне, сабрала гуманітарную дапамогу».

У прадуктовыя наборы ўвайшлі мясныя кансервы, кашы, дзіцячае харчаванне, кісламалочныя прадукты, хлебабулачныя вырабы і садавіна. Гуманітарны груз адправілі ў гэты ж дзень на граніцу.

— Калі мы звярнуліся да членаў «Белай Русі», усе разумелі важнасць і неабходнасць аказаць садзейнічанне. Усё, што мы робім для людзей, якія маюць патрэбу ў нашай дапамозе, — ад чыстага сэрца, — адзначыла яна.

— На граніцы знаходзяцца дзеці, жанчыны, у тым ліку цяжарныя. Людзям вельмі цяжка, яны апынуліся ў складанай жыццёвай сітуацыі, і кожны з іх мае патрэбу ў дапамозе, — дадала **старшыня Заводскай раённай арганізацыі РГА «Белая Русь» Святлана ЛЯВОНЕНКА.**

### Дапамога, якая патрэбна

**Да гуманітарнай місіі далучыліся і прафсаюзныя арганізацыі з усіх абласцей. Яны таксама накіравалі гуманітарную дапамогу бежанцам на граніцу.**

Як расказалі ў прэс-службе ФПБ, гэта больш за дзве тысячы мясных кансерваў, каля тысячы боханаў хлеба і столькі ж упаковак малака, сфарміраваныя наборы для дзіцячага харчавання, прадукты хуткага прыгатавання, сухафрукты, пячэнне, сокі, пюрэ. Акрамя таго, у складзе гуманітарнай дапамогі — коўдры і цёплыя рэчы, падгузнікі для дзяцей. Усяго, акрамя ўжо аказанай дапамогі ў папярэднія дні, накіравана больш за шэсць тон тавараў.

— Уся гэтая прадукцыя зараз цэнтралізавана збіраецца на складах у Гродне і будзе перададзена на граніцу ў выглядзе ўжо сфарміраваных набораў. Пасля тых выпрабаванняў, якія прыйшлося перажыць бежанцам на граніцы, гэта дапамога будзе асабліва запатрабавана. Практычна суткі людзі, у тым ліку і дзеці, былі без ежы і цяпла, пры мінусавай тэмпературы апынуліся пад прыцэлам вадамётаў. У гэтай сітуацыі, вядома ж, ім будуць неабходны і дадатковае адзенне, і цёплыя рэчы, каб сагрэцца. Як паказвае практыка мінулых дзён, прадукты, асабліва дзіцячае харчаванне, таксама заўсёды патрэбны ў стыхійным лагеры бежанцаў, — адзначылі ў нацыянальным прафцэнтры.

Тут падкрэслілі, што прафсаюзы гатовы і ў далейшым пры неабходнасці падтрымліваць людзей, якія апынуліся ў гэтай складанай сітуацыі, і аказваць ім пасільную дапамогу.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

Кантэкст

# «НАС ЗАБІВАЮЦЬ»

## Бежанцы трапілі пад вадамёты, слёзатачывы газ і гранаты

**Беларускі бок ініцыіруе расследаванне інцыдэнту на граніцы з Польшчай, паведаміў БелТА афіцыйны прадстаўнік Дзяржпагранкамітэта Антон Бычкоўскі. «Апоўдні 16 лістапада сітуацыя паблізу часовага размяшчэння бежанцаў у пункце пропуску «Брузгі» каля граніцы абвастрылася. Некаторыя мужчыны з ліку іншаземцаў, даведзеныя да адчаю ад невыносных умоў, у якіх знаходзіліся яны самі і іх сем'і апошнія суткі, зрабілі спробу прарвацца на тэрыторыю Польшчы. Для гэтага яны накіраваліся да загарод і паспрабавалі іх дэманціраваць, — адзначыў ён. — У адказ польскі бок накіраваў на няўзброеных бежанцаў струмені вадамёта і прымяніў святлошумавыя гранаты».**

Такое прымяненне польскімі сілавікамі спецсродкаў і боепрыпасаў у адносінах да няўзброеных людзей на беларускім баку зафіксавана. «Гэта расцэньваецца не інакш як гвалтоўныя дзеянні ў адносінах да асоб, якія знаходзяцца на тэрыторыі іншай краіны», — адзначыў Антон Бычкоўскі.

Польскія сілавікі прымянілі спецсродкі, якія змяшчаюць таксічныя хімікаты. Аб гэтым заявіў намеснік начальніка ўпраўлення радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны і экалогіі Генеральнага штаба Узброеных Сіл Ігар Малык, паведаміла БелТА. «Мы сталі сведкамі таго, як польскія сілавікі на беларуска-польскай граніцы ў адносінах да бежанцаў, сярод якіх жанчыны і дзеці, прымянялі спецыяльныя сродкі, якія змяшчаюць таксічныя хімікаты раздражняльнага дзеяння. Неабдуманае прымяненне падобных сродкаў можа прывесці да незваротных наступстваў для здароўя людзей, пашкоджваючы органы дыхання і зроку. Найбольшую небяспеку гэта ўяўляе для людзей, якія маюць хранічныя захворванні дадзеных органаў», — распавёў Ігар Малык.

Следчы камітэт праводзіць праверку па факце прымянення спецыяльных сродкаў і боепрыпасаў у дачыненні да бяззбройных грамадзян і прычынення ім цялесных пашкоджанняў на тэрыторыі беларуска-польскай граніцы ў пункце пропуску «Брузгі», паведаміла БелТА. На месцы працуе следча-апаратыўная група, задзейнічана перасоўная крыміналістычная лабараторыя ведамства. Работа працягнецца і ў начны час з выкарыстаннем асвятляльнага абсталявання. Пачаты агляд месца здарэння на тэрыторыі Беларусі, праводзіцца работа з пацярпелымі. Фіксуецца абстаноўка на месцы здарэння, адбіраюцца сляды і аб'екты, па якіх плануецца назначэнне экспертыз.

Адметна, што напярэдадні польскі бок павялічыў парк спецтэхнікі. Пагранічная варта Польшчы ў выпадку неабходнасці прымяніць зброю без ваганняў, заявіла афіцыйны прадстаўнік Пагранічнай варты Польшчы Ганна Міхальская, паведаміла РІА «Навіны». «Мы на ўсе дзяжурствы выходзім з баявой зброяй. Мы — сілавая структура, мы праходзім трэніроўкі, каб у выпадку неабходнасці прымяніць гэту зброю. Магу запэўніць, што калі будзе патрэбна, супрацоўнікі Пагранічнай варты не будуць вагацца з выкарыстаннем зброі», — сказала Міхальская.

Даведзеныя да адчаю бежанцы спрабавалі прайсці на польскую тэрыторыю. Палякі ў сваю чаргу выкарыстоўвалі слёзатачывы газ і светлашумавыя гранаты. Бежанцы гаварылі, што яны стаміліся чакаць. Палякі на холадзе палівалі людзей вадой і жоўтай вадкасцю, якая выклікае пякоту. Людзі задыхаліся, дзеці плакалі, газ раз'ядаў ім вочы. Некаторых ванітавала. Бежанка з Ірака расказала, што перажыла: «У мяне двое дзяцей. Я хачу трапіць у Германію, бо на радзіме небяспечна. Тут мы знаходзімся 6 дзён. Вельмі стаміліся. Многія трапілі пад вадамёт і слёзатачывы газ. Гэта жахліва. Нас палохае невядомасць. Мы не жадаем менавіта ў Польшчу, наша мэта — Германія».

Захад даслаў салдат і разбурыў іх краіны, а зараз не жадае дапамагаць бежанцам. Такім меркаваннем з журналістамі падзяліліся бежанцы з лагера, які ўтварыўся ва ўездзе ў польскі пункт пропуску. Бежанцы, якія пакінулі напярэдадні лагер каля лініі польскай граніцы, правялі халодную ноч каля ўезду ў польскі пункт пропуску «Кузня Беластоцкая». Многія з іх скардзіліся не толькі на ледзяны холад, але і на недахоп харчавання і вады. Сярод бежанцаў шмат сем'яў з дзецьмі. У Польшчу іх не прапускаюць.

«Чаму гэта адбываецца? Захад даслаў тысячы салдат, якія разбурылі нашу краіну, а зараз не хочуць прымаць нас», — эмацыянальна выказаўся адзін з бежанцаў. Ён заўважыў, што шмат хто літаральна памірае ад холаду.

«Справа не ў нас. Ратуйце хоць бы нашых дзяцей. Нам няма куды вяртацца», — падкрэслівае мужчына. Ён кажа, што ЕС не стрымаў свае абяцанні. «Усё гэта вялікая хлусня. Мы не верым словам Еўрасаюза. Няхай бы пачулі плач дзяцей гэтай халоднай ноччу. Яны літаральна нас забіваюць», — з плачам сказала адна з жанчын у лагеры.



Беларускія медыкі аператыўна аказалі дапамогу пацярпелым ад слёзатачывага газу і вадамётаў бежанцам і журналістам, паведаміла начальнік упраўлення аховы здароўя Гродзенскага аблвыканкама Людміла Кеда. Асноўныя скаргі, з якімі звярталіся людзі, — слабасць, кашаль, тэмпература. Гэта звязана з пастаянным знаходжаннем на вуліцы, пераахаладжэннем і вільготным адзеннем. Пасля прымянення слезатачывага газу польскім бокам людзі звярталіся са скаргамі на боль і рэзь у вачах, а таксама цяжкасць дыхання.

У Міністэрстве замежных спраў Беларусі пракаментавалі правакацыі на беларуска-польскай граніцы — прымяненне польскім бокам спецыяльных сродкаў супраць бежанцаў. «Адбываецца прамая правакацыя пагранічных інцыдэнтаў з польскага боку. Спецсродкі прымяняюцца па тэрыторыі Беларусі. Безабаронных людзей атручваюць газам і глушаць святлошумавымі гранатамі. Больш за тое, у нас ёсць інфармацыя, што польскія сілавікі пачалі ўжо нават кідаць у людзей камяні. Ёсць пацярпелыя. І гэта аб'ектыўная рэальнасць дзеянняў краіны, якая прадаўжае вучыць сваіх суседзяў правільнай дэмакратыі і павазе правоў чалавека. Што будзе наступнае — гуманітарны артылерыйскі абстрэл абяздоленых жанчын і дзяцей на граніцы?» — сказаў прэс-сакратар МЗС Анатоль Глаз.

Ён адзначыў, што няма сэнсу гаварыць аб тым, што такія дзеянні прама парушаюць шэраг міжнародных і двухбаковых норм і дагавораў. «Складана ў прынцыпе ўявіць, як можна растлумачыць прымяненне спецсродкаў па тэрыторыі іншай суверэннай дзяржавы. Таму з нашага боку абавязкова будзе адпаведная афіцыйная рэакцыя, — заявіў прэс-сакратар. — Мы ініцыіруем расследаванне інцыдэнту з прыцягненнем міжнародных арганізацый, паколькі ўсе факты відавочныя. Але мы не пойдзем на повадзе ў гэтых правакацый».

Анатоль Глаз заявіў, што беларускі бок зацікаўлены ў цывілізаваным вырашэнні сітуацыі з улікам інтарэсаў людзей, і пастаянна гэта паўтарае: «І пакуль Польшча палівае іх з вадамёта, Беларусь штодзённа аказвае гуманітарную дапамогу», — заўважыў ён.

Паводле слоў прадстаўніка МЗС, мэта польскага боку цалкам зразумелая: яму неабходна яшчэ больш абвастрыць абстаноўку, у корані задушыць любыя зрухі па ўрэгуляванні сітуацыі ў нармальным ключы. «Таму пасля прадметнага абмеркавання пытання ўчора на вышэйшым узроўні мы бачым сёння з польскага боку прамыя правакацыі і бесчалавечнае абыходжанне з абяздоленымі. Вядома, гэтыя здзекі павінны быць спынены. Яшчэ раз паўтару, што мы заўсёды былі і застаёмся зацікаўленымі ў нармальным, канструктыўным і цывілізаваным вырашэнні сітуацыі», — рэзюмаваў прэс-сакратар МЗС.

Міністэрства інфармацыі Беларусі асудзіла дзеянні польскіх сілавікоў у адносінах да айчынных і замежных журналістаў, якія працуюць на беларуска-польскай граніцы, паведамілі БелТА ў ведамстве. «У выніку прымянення з польскага боку спецсродкаў многія з прадстаўнікоў медыя трапілі пад дзеянне невядомай хімічнай вадкасці, якая выклікае слёзацячэнне, кашаль, удушша, і былі вымушаны звярнуцца па медыцынскую дапамогу. Акрамя таго, заліта фота- і відэаапаратура», — адзначылі ў міністэрстве. Такія дзеянні Мініфарм расцэньвае «як непрыкрытую перашкоду журналістам у ажыццяўленні сваёй прафесійнай дзейнасці і незацікаўленасць афіцыйных польскіх улад у аб'ектыўным і ўсебаковым асвятленні падзей, якія адбываюцца на беларуска-польскай граніцы».

Тым часам замежныя СМІ, якія працуюць на граніцы, рэзка змянілі рыторыку выказванняў у сваіх рэпартажах. Пад рэдакцыйным ціскам журналісты скажаюць відавочныя факты і ўкідваюць фэйкі. У прыватнасці, паглядзіце, якім чынам асвятляюць падзеі тыя ж Sky News і Euronews. Дарэчы, рыхтуюць яны свае матэрыялы на беларускай тэрыторыі, польскі бок ім такой магчымасці не даў.

Міжнародная федэрацыя таварыстваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца (МФЧК) заклікала да тэрміновай дээскалацыі сітуацыі на граніцы Беларусі і Польшчы і забеспячэння доступу гуманітарных арганізацый да мігрантаў для прадухілення новых смярцей. Аб гэтым гаворыцца ў распаўсюджаным прэс-рэлізе МФЧК, паведаміла ТАСС.

«Мы занепакоены сітуацыяй, якая пагаршаецца на граніцы Польшчы і Беларусі, пасля таго як 8 лістапада туды прыбыла вялікая колькасць мігрантаў. Мы заклікаем даць доступ Чырвонаму Крыжу і іншым гуманітарным арганізацыям, каб усе людзі на граніцы і ў іншых месцах маглі атрымаць медыцынскую і гуманітарную дапамогу», — прыводзяцца словы кіраўніка аддзела МФЧК па стыхійных бедствах, клімаце і крызісах у Еўропе Андрэаса фон Вайсенберга. Паводле яго слоў, беларускі Чырвоны Крыж атрымаў доступ для аказання жыццёва важнай дапамогі людзям, якія сутыкнуліся з голадам і холадам. «Неабходна таксама, каб доступ быў дадзены з другога боку граніцы. З людзьмі трэба абыходзіцца гуманна», — падкрэсліў Андрэас фон Вайсенберг.

«Мы дазваляем бежанцам паміраць, узводзячы калючыя сцены». Такую думку ў эфіры «Беларусь 1» выказаў патэнцыйны кандыдат у прэзідэнты Францыі, дэпутат Еўрапарламента Янік Жадо, каментуючы сітуацыю на беларуска-польскай граніцы. «Гэта ўсяго 4 тысячы чалавек, якія нікому не пагражаюць. Наша бяспека не падвяргаецца сумненню. Яны не збіраюцца нас захопліваць, а мы даём магчымасць ім паміраць у лесе, узводзячы калючыя сцены», — адзначыў Янік Жадо. Еўрадэпутат падкрэсліў: пяць гадоў таму ўсе былі безуважныя да прамовы Трампа аб сцяне паміж ЗША і Мексікай. «Сёння ўжо лідары Еўропы гавораць тое ж самае. Гэта проста абурае», — дадаў ён.

Дзеянні Польшчы ў адносінах да бежанцаў — чыста палітычная гульня. Такое меркаванне ў эфіры тэлеканала «Беларусь 1» выказаў дацэнт кафедры палітычнай тэорыі МДІМЗ Кірыл Коктыш. «Гэта чыста палітычная гульня. Наогул абсурдная, улічваючы, што прынамсі тры нямецкія гарады гатовы прыняць бежанцаў. Паколькі значная частка бежанцаў — гэта курды, а курдам Германія аўтаматам дае прытулак. Той факт, што палякі сталі намёртва жывым шчытом паміж Германіяй, дзе бежанцы легальныя, і бежанцамі, — ні чым іншым, як спробай палітызаваць і ссекчы максімум бонусаў на гэтай сітуацыі, растлумачыць немагчыма», — сказаў Кірыл Коктыш. Эксперт падкрэсліў, што ў гэтым плане Беларусь фактычна дзейнічае як еўрапеізатар, нагадваючы Еўропе пра каштоўнасці, якія яна дэкларуе.

Ад зыходу сітуацыі з бежанцамі залежыць і стрымліванне Еўропы ад рэгіянальнага крызісу. Такой думкай у сваім тэлеграм-канале падзяліўся дырэктар Цэнтра па праблемах еўрапейскай інтэграцыі палітычны аналітык Юрый Шаўцоў. «Вялікае дзівацтва свету: вось гэтыя людзі сваімі пакутамі спрабуюць не толькі даць сабе і сваім сем'ям лепшае жыццё. Гэтыя курды, арабы, афганцы, людзі з чорнай Афрыкі стрымліваюць вар'яцтва нацыяналізму», — лічыць эксперт.

Паводле яго слоў, у аснове гэтага нацыяналізму — імкненне Польшчы стварыць новую версію Рэчы Паспалітай. «Памяншэнне рэгіянальнага значэння Польшчы з-за гуманітарнага крызісу на граніцы — гэта крок у бок ад чырвонай лініі спаўзання Усходняй Еўропы да стану вялізнага ўзарванага вайной Данбаса. Чым хутчэй усе гэтыя ўсходнія людзі апынуцца ў Германіі, тым больш будзе шанцаў, што і сама Польшча не ўпадзе ў стан часоў Пілсудскага і Рыдз-Сміглы зноў. І ўвесь рэгіён за сабой не пацягне да новай вялікай катастрофы», — заўважыў Юрый Шаўцоў.

**Пётр ДУНЬКО.**



# ЗЯМЛІ НАДЗЕЙНАЯ АПОРА

Пружанскі раён

**Спецвыпуск да Дня работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці**

# ШЧОДРАЯ ПРУЖАНСКАЯ ВОСЕНЬ

## З якімі поспехамі і якім настроем сустракаюць аграрыі прафесійнае свята

**Напярэдадні свята мы сустрэліся з першым намеснікам старшыні Пружанскага райвыканкама Таццянай ВАРАБ'ЁВАЙ, каб пагаварыць пра вынікі сельскагаспадарчага года, пра поспехі і дасягненні, з якімі аграрыі раёна сустракаюць дзень працаўнікоў вёскі.**


Фота Аліны МАЗАВЕЦ.

***— Таццяна Анатольеўна, структура, якую вы ўзначальваеце, называецца ўпраўленнем па сельскай гаспадарцы і харчаванні. Таму першае пытанне пра харчаванне: што паказалі восеньскія кірмашы, якую прадукцыю набывалі людзі на зіму, якія прадпрыемствы паказалі сябе актыўнымі ўдзельнікамі восеньскіх пашыраных продажаў?***

— Кірмашы традыцыйна праходзілі ў вялікіх населеных пунктах Ружанах і Шарашэве, адбыўся таксама раённы кірмаш «Пружанская восень». Акрамя таго, нашы прадпрыемствы і арганізацыі ўдзельнічалі ў аналагічных мерапрыемствах абласнога цэнтра. Актыўнасць праявілі як сельгасарганізацыі, так і фермеры. Найбольшым попытам карысталіся агародніна і садавіна, шмат прадалі бульбы. Многія нашы гаспадаркі маюць яблыневыя сады, яны прывозілі яблыкі. ААТ «Пружанскае» парадавала пакупнікоў буракамі, капустай, морквай. Мясныя паўфабрыкаты ААТ «Жураўлінае» і ААТ «Ружаны-Агра» карысталіся павышаным попытам з-за высокай якасці прадукцыі і даступнай цаны.

***— З якімі поспехамі сустракаюць прафесійнае свята жывёлаводы? Ці вынікае з паказчыкаў, што выраз «малочныя рэкі» для Пружаншчыны не метафара, а рэальнасць?***

— Па выніках мінулага года сельгасарганізацыі раёна забяспечылі самы высокі ў вобласці паказчык па валавой вытворчасці, а таксама па якасці малака, якое рэалізоўваецца. Па прадукцыйнасці дойнага статку раён займае шостае месца з 16 раёнаў вобласці. Указаныя пазіцыі захоўваюцца і ў бягучым перыядзе 2021 года. Сярод сельгасарганізацый несумненнымі лідарамі па вытворчасці малака з'яўляюцца адкрытыя акцыянерныя таварыствы «Велікасельскае Агра», «Агра-Калядзічы», «Мурава», «Шані-Аграпрадукт», «Жураўлінае», «Ружаны-Агра». Уражваюць поспехі нашых жывёлаводаў у галіне якасці. Летась 93,9 працэнта малака рэалізавана сортам «экстра», 5,9 працэнта — вышэйшым.

Лідарамі па вытворчасці мяса з'яўляюцца ААТ «Жураўлінае» і ААТ «Ружаны-Агра». Нашы работнікі сферы жывёлагадоўлі штогод адзначаюцца як передавікі галіны, залаты фонд кадравага саставу аграпрамысловага комплексу вобласці і краіны.

Напярэдадні свята хочацца назваць многіх. Найлепшыя працуюць у ААТ «Велікасельскае Агра» — Ірына Субота, Галіна Сямашка, Вольга Пахар, Вячаслаў Нікіфараў, Антон Чэга, Кацярына Тарасевіч; у ААТ «Ружаны-Агра» — Таццяна Цяцерская, Наталля Сямко, Жанна Харытончык, Ала Плашэй, Ніна Галавейка, Наталля Густыр, Алена Стук, Іван Палубок, Наталля Кульба, Галіна Шлевяда, Таццяна Буткевіч, Наталля Русакевіч, Ніна Макарэвіч, Таццяна Лямешка, Надзея Багоўкава, Людміла Вансоўская, Іна Жышко; у ААТ «Шані-Аграпрадукт» — Эла Ламакіна, Валянціна Бабрук, Уладзімір Асіпчук, Алена Рубель, Дзмітрый Шпарла; у ААТ «Жураўлінае» — Любоў Кавалевіч, Лідзія Сельвіч, Наталля Карпеш, Іна Мацяс, Святлана Ерамейка, Наталля Шлыкава, Аліна Бурнас, Іна Шакайла, Вольга Дымкова; у «Агра-Калядзічы» Юлія Герасімік, Наталля Бескаравайная, Надзея Цап, Ірына Шэўчык; у ААТ «Мурава» — Надзея Свістун, Наталля Федзік, Алеся Новікава; у ААТ «Пружанскі райаграсэрвіс» Ніна Касюк.


Фота Алены ДАЎЖАНОК.

Жывёлагадоўчая галіна паступальна развіваецца, укараняюцца і замацоўваюцца новыя тэхналогіі, паспяхова вядзецца племянная работа. Зараз на тэрыторыі раёна рэалізоўваюцца наступныя інвестпраекты: будаўніцтва малочнатаварнай фермы каля вёскі Вялікае Сяло (ААТ «Велікасельскае Агра»), будаўніцтва камбікормавага цэха ў ААТ «Агра-Калядзічы», таксама вядзецца будаўніцтва двух кароўнікаў на тэрыторыі фермы Варотнае ААТ «Ліноўскае». Адзін з іх, дарэчы, днямі ўведзены ў эксплуатацыю.

***— На абласных «Дажынках» пружанскіх аграрыяў адзначалі за важкі каравай гэтага года. Хто найлепш працуе ў галіне раслінаводства, як развіваецца галіна? Наколькі паспяхова прайшла сяўба азімых?***

— Атрыманы аграрыямі раёна валавы збор збожжа зерневых і каласавых культур у аб'ёме 106 тысяч тон заняў дастойнае месца ў абласным каравае. Галоўны паказчык работы галіны — ураджайнасць палёў. Найлепшых паказчыкаў сёлета дасягнулі ААТ «Мурава» — 50 цэнтнераў з гектара, ААТ «Агра-Калядзічы» — 49,5 цэнтнера і ААТ «Велікасельскае Агра» — 47,1 цэнтнера. Па выніках абласнога спаборніцтва за дасягненне высокіх паказчыкаў на ўборцы ўраджаю збожжавых і зернебабовых найлепшай гаспадаркай стала «Велікасельскае Агра», сярод камбайнераў адзначаны экіпаж Пятра Мартынюка з ААТ «Айчына», сярод галоўных аграномаў найлепшым названы галоўны агранoм ААТ «Агра-Калядзічы» Леанід Чарняк.

Варта сказаць, што гэтай восенню паспяхова праведзена сяўба азімых, што дае падставы чакаць добрага ўраджаю налета. Азімыя ў раёне складаюць 61 працэнт збожжавага кліна, таму якасная работа падчас кампаніі асабліва важная. Аграрыі справіліся з работай у сціслыя тэрміны, нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы надвор'я.


Фота Алены ДАЎЖАНОК.

***— Якое месца ў аграрнай вытворчасці раёна займаюць фермерскія гаспадаркі? Ці ёсць такія, хто працуе цікава, дэманструе добрыя вынікі?***

— Удзельная вага сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак у агульным аб'ёме валавой сельгаспрадукцыі невысокая і складае каля 1 працэнта. У сярэднім на адну фермерскую гаспадарку прыходзіцца каля 38 гектараў сельгасугоддзяў, у іх ліку каля 29 гектараў ворыва. Фермеры ў нас найбольш займаюцца вырошчваннем збожжавых культур, агародніны, садавіны, ягад, бульбы. Напрыклад, гаспадарка «Бардо» вырошчвае бульбу. На другім хлебе спецыялізуюцца таксама фермерскія гаспадаркі «Тукана» і «Галаша». Добрых поспехаў у садаводстве дасягнулі фермеры з гаспадаркі «Тытул-Агра» і іх калегі у «ТЭК». Агароднінай паспяхова займаюцца «ШаніАгародніна», гаспадаркі «Барычэўскага П. І.» і «Каштанаўскае».

***— Як сельгаспрадпрыемствы забяспечаны кадрамі спецыялістаў? Ці ёсць праблемы?***

— Рухавіком тэхналагічнага прагрэсу, як вядома, з'яўляюцца кадры. Іх падрыхтоўцы, пытанням забеспячэння кадрамі ўдзяляецца вялікая ўвага. Больш за палову нашых спецыялістаў маюць вышэйшую адукацыю. Каля 28,8 працэнта з іх ва ўзросце да 31 года. Прыцягненне маладых спецыялістаў у сельгасарганізацыі — задача прыярытэтная. Каб іх зацікавіць і заахвоціць застацца, ствараюцца адпаведныя ўмовы. Найперш гаворка ідзе пра добраўпарадкаванае жыллё, дастойную заработную плату, добрыя ўмовы працы. Мае значэнне таксама арганізацыя адпачынку і вольнага часу, магчымасць прасоўвання па службовай лесвіцы. На ўсё пералічанае ў нас можа разлічваць малады спецыяліст.

Штогод у сельгасарганізацыі раёна прыбывае ў сярэднім 80 спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй. Сёлета да нас прыйшлі 18 чалавек з дыпломамі ВНУ і 54 чалавекі з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Аналіз паказвае, што ў апошнія гады пасля неабходнай адпрацоўкі застаецца прыкладна палова маладых спецыялістаў. Найбольш запатрабаваныя зараз спецыялісты жывёлагадоўчай галіны — заатэхнікі і ветурачы. Стымулам для іх у нашым раёне можа стаць добрая зарплата. За 9 месяцаў яе ўзровень па галіне склаў 1122 рублі. Пра іншыя прэферэнцыі сказана вышэй.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ПАД АХОВАЙ КАЗАНСКАЙ ІКОНЫ БОЖАЙ МАЦІ

**Праваслаўны храм у вёсцы Мурава адзначыў свой 25-гадовы юбілей. Урачыстае богаслужэнне з гэтай нагоды ўзначаліў архіепіскап Брэсцкі і Кобрынскі Іаан. Сярод прыхаджан храма былі старшыня Пружанскага райвыканкама Юрый Бісун, старшыня раённага Савета дэпутатаў Мікалай Кудравец, кіраўнікі мясцовай улады і тутэйшай гаспадаркі.**

А будавалі царкву ў пачатку дзевяностых, як прынята гаварыць, усім мірам. Рэч у тым, што храм, узведзены ў Мураве ў сярэдзіне XIX стагоддзя, разбурылі ў сярэдзіне XX, у часы ваяўнічага атэізму. Крыху больш за чвэрць стагоддзя таму вясковая грамада пастанавіла адрадзіць сваю святыню. Узвядзенне пачалося ў 1991 годзе, грошы ахвяравалі фундатары, прыхаджане. Але асноўныя расходы ўзяў на сябе тагачасны калгас імя Калініна, якім кіраваў Пётр Білецкі.

Пётр Мікалаевіч да гэтай пары ўзначальвае гаспадарку, цяпер яна называецца ААТ «Мурава». І ў юбілейны дзень царквы ў ліку іншых рупліўцаў і фундатараў Пётр Білецкі адзначаны архіпастырскай узнагародай.

Храм падышоў да свайго юбілею абноўленым і ўпрыгожаным, сустракаў прыхаджан і гасцей мілагучным перазвонам. Пасля ўрачыстага богаслужэння адбыўся традыцыйны хрэсны ход.

**Яна СВЕТАВА.**

# КАЛІ ЁСЦЬ КАМАНДА — БУДУЦЬ І ВЫНІКІ

У калектыве ААТ «Шані-аграпрадукт» агульны вынік успрымаецца як асабістае дасягненне


Дырэктар ААТ «Шані-аграпрадукт» Дзмітрый ХВАСТОЎ.





На малочна-таварным комплексе «Шані».

**Стужка асфальтаванай дарогі бяжыць уздоўж зжатых, гатовых да зімы палёў. Але казаць аб завяршэнні ўборачнай пакуль рана: вядзецца нарыхтоўка сіласу і ўборка кукурузы на зерне. Наперадзе яшчэ ўборка траў.**

«Шані-аграпрадукт» — адна з найбольш паспяховых гаспадарак Пружанскага раёна.

— Сярод раённых сельгасарганізацый мы ў пяцёрцы лідараў, — не без гонару гаворыць **дырэктар прадпрыемства Дзмітрый ХВАСТОЎ.**

Гаспадарка не маленькая — плошча раллі складае 4114 га, сельгасугоддзяў — 7698 га. Максімальная валавая вытворчасць збожжа за ўсю гісторыю была атрымана некалькі гадоў таму: ураджайнасць склала 45 ц/га, ураджай рапсу — 25,3 ц/га, адзначае кіраўнік.

— А ў гэтым годзе, калі казаць аб валавай вытворчасці, мы змаглі атрымаць больш чым 1000 тон алейнага насення рапсу, — падкрэслівае ён.

Традыцыйна добра працуе гаспадарка і па цукровых бураках.

— Самым паспяховым у гэтых адносінах быў 2019 год: валавая вытворчасць цукровых буракоў склала 18 тысяч тон пры ўраджайнасці 691,5 ц/га, — успамінае суразмоўца.

Але і ў гэтым годзе ўжо ясна, што вынік будзе добры, хоць уборка салодкага кораня яшчэ далёкая да завяршэння.

— Па рэнтабельнасці гаспадарка выглядае нядрэнна. На сёння рэнтабельнасць вытворчасці складае 22 % і 15,7 % — рэнтабельнасць продажаў, — адзначае Дзмітрый Мікалаевіч. — І за ўсімі гэтымі вынікамі стаіць наш калектыў, нашы працавітыя, умелыя і адказныя людзі.

Пад'язджаем да цэнтральнай сядзібы: дамы агорнуты ранішнім туманам. Статус аграгарадка прысвоены вёсцы Шані ў 2006 годзе, адной з першых у Пружанскім раёне. Гаспадарка аб'ядноўвае 20 населеных пунктаў з агульнай колькасцю насельніцтва 1348 чалавек. І практычна кожная сям'я так ці інакш мае дачыненне да ААТ «Шані-аграпрадукт».

## Стабільнасць у прыярытэце

На пытанне, каго з работнікаў можна назваць перадавікамі вытворчасці, Дзмітрый Мікалаевіч пацiскае плячыма:

— У нас усе — майстры сваёй справы. Увесь калектыў унёс уклад у нашы паказчыкі. Калі ёсць каманда — будзе і вынік. Напярэдадні Дня работнікаў сельскай гаспадаркі хацелася б асабліва вылучыць супрацоўнікаў нашай інжынернай службы і **галоўнага інжынера Сяргея ЯКУТУ.** Дарэчы, у нашай гаспадарцы працуе ўся яго сям'я — і жонка, і сын. Таксама хачу падзякаваць за працу **інжынеру Уладзіміру КАЛЯДЗЕ і начальніку малочна-таварнай фермы «Шані» Дзмітрыю ШПАРЛУ**, якi ў мінулым годзе быў прызнаны найлепшым кіраўніком МТК Пружанскага раёна. А ў цэлым усе спецыялісты ў нас на сваіх месцах, ведаюць справу, дбаюць аб агульным выніку.


Інспектар па кадрах Наталля КАСЬЯН.

Калектыў супрацоўнікаў ААТ «Шані-аграпрадукт» — больш чым трыста чалавек. Многія працуюць на прадпрыемстве 10 і больш гадоў, ёсць спецыялісты з трыццацігадовым стажам.

— Мы можам прапанаваць поўны сацпакет, жыллём забяспечваем на сто працэнтаў: гэта і дамы індывідуальнага тыпу для сем'яў, і кватэры для моладзі, — тлумачыць **інспектар па кадрах Наталля КАСЬЯН.** — На тэрыторыі гаспадаркі ёсць сярэдняя школа і два дзіцячыя садкі. Медыцынскую дапамогу аказваюць тры фельчарска-акушэрскія пункты, гандлёвая сетка — чатыры крамы, ёсць сталовая, клуб і бібліятэка.

Сельскагаспадарчую працу лёгкай не назавеш. Але ва ўсе часы людзі цэняць стабільнасць і ўпэўненасць у заўтрашнім дні — і менавіта на гэта робіць акцэнт кіраўніцтва ААТ «Шані-аграпрадукт».

— Па ўзроўні заработнай платы наша прадпрыемства — на трэцім месцы ў раёне, — кажа Дзмітрый Хвастоў. — Сярэднямесячная зарплата па гаспадарцы — 1250 рублёў, рост да ўзроўню мінулага года склаў 15 %.


Дынастыя Якута каля свайго дома: сын Віктар, бацькі Ганна і Сяргей. Уся сям'я працуе на ААТ «Шані-аграпрадукт».

## «Не кабінетныя» людзі

Віктар Якута прыйшоў у гаспадарку па слядах бацькі — Сяргей Якута ў ААТ «Шані-аграпрадукт» працуе ўжо амаль тры дзесяцігоддзі і сёння займае адказную пасаду галоўнага інжынера гэтай буйной гаспадаркі. Услед за бацькам і сын пасля заканчэння Пружанскага аграрна-тэхнічнага каледжа вярнуўся ў родныя мясціны. Сфера яго адказнасці — механізацыя працаёмкіх працэсаў. Водгукі аб ім — самыя лепшыя.

— Гэта вельмі прафесійны малады спецыяліст, — характарызуюць Віктара ў аддзеле кадраў прадпрыемства. — Ён курыруе работу сучасных даільных установак DeLaval і праграмнага забеспячэння працэсу даення. На прадпрыемстве яго вельмі цэняць. А з дзяўчат, якія прыйшлі да нас працаваць, хацелася б адзначыць ветурача Ліяну Нагібіну. Дастаткова сказаць, што ў адсутнасць галоўнага ветурача мы нават ставім яе на падмену, і яна выдатна спраўляецца.

Кіраўнік гаспадаркі ў ААТ «Шані-аграпрадукт» працуе ўжо амаль пяць гадоў.

— Прыйшоў галоўным заатэхнікам, у жніўні 2018-га стаў дырэктарам, — успамінае Дзмітрый Мікалаевіч. — А ў цэлым у сельскагаспадарчай сферы — з 2005 года.

Аб сабе кіраўнік кажа: «Я не кабінетны чалавек. На палях і фермах пачуваюся лепш, чым за сталом».

— За што люблю працу ў сельскай гаспадарцы? А я больш нідзе і не працаваў, няма з чым параўноўваць... Ну, а калі сур'ёзна, праца гэтая... жывая. Усё расце, змяняецца да лепшага, ты бачыш вынік сваіх намаганняў. Гэта маё, гэта мне цікава. Жывёлагадоўлю ведаю літаральна з самых нізоў: пачынаў памочнікам начальніка МТК і прайшоў усе прыступкі кар'ернай лесвіцы.


Жывёлавод Аляксандр ЧАТЫРБОК каля мабільнага камбікормавага завода.

## Незаменныя ёсць!

ААТ «Шані-аграпрадукт» спецыялізуецца на вытворчасці малака.

— Сёлета мы дасягнулі максімальнага пагалоўя буйной рагатай жывёлы і максімуму валавой вытворчасці малака ў гісторыі прадпрыемства. На карову летась надаілі 7370 літраў малака, па выніках гэтага года чакаем прырост да гэтай лічбы 5—10 %. Сёння доім 20 літраў малака на карову ў дзень — надоі вышэйшыя толькі ў трох аграпрадпрыемствах Пружанскага раёна. 90 % малака стабільна здаём сортам «экстра» — нядрэнны вынік.

Ад чаго ж залежаць надоі?

— Перш за ўсё, ад якасці кармоў. Кармамі мы цалкам забяспечваем сябе самі. Сёння ў нас нарыхтавана сіласу практычна 40 тысяч тонн. Таксама ўпершыню ў гісторыі ААТ «Шані-аграпрадукт» мы нарыхтавалі каля 30 тысяч тон сенажу. Гэты год быў спрыяльны для траў і кукурузы. Акрамя таго, мы сур'ёзна працавалі над гэтым пытаннем: падбіралі гібрыды французскай і нямецкай селекцый, вывучалі вопыт іншых гаспадарак.

У гаспадарцы працуе ўласны мабільны камбікормавы завод — «млын», як кажуць тут. А рэцэпты камбікорму распрацоўвае заатэхнічная служба прадпрыемства.

— Па малаку ў нас штогадовы прырост, і ў гэтым годзе, спадзяюся, паб'ём уласны леташні рэкорд.

Кажуць, незаменных не бывае. Але **начальнік малочна-таварнага комплексу «Шані» Дзмітрый ШПАРЛА** з гэтым не згодны: у жывёлагадоўлі надзвычай важны талент, і кожны таленавіты жывёлавод — незаменны. Вынік такога падыходу да працы — 25 літраў малака ў дзень з адной каровы.

На МТК «Шані» працуе 26 чалавек, якія абслугоўваюць велізарны статак — 2300 галоў буйной рагатай жывёлы: цёлкі, быкі, маладняк, нованароджаныя цяляты... Ферма мадэрнізаваная па апошнім слове тэхнікі, але ніякія тэхналогіі не заменяць добрых чалавечых рук.

Асаблівасць сельскагаспадарчай працы ў тым, што яна падтрымлівае ў тонусе круглыя суткі, кажуць супрацоўнікі ААТ «Шані-аграпрадукт». І таму агульны вынік тут успрымаюць як асабістае дасягненне.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ,**
**Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Аліны МАЗАВЕЦ.**

УНП 200026194


Дзмітрый ШПАРЛА, начальнік малочна-таварнага комплексу «Шані».

# ШТО ПАСЕЕШ, ТОЕ І ПАЖНЕШ

## Залогам поспеху ў ААТ «Велікасельскае Агра» лічаць прафесіяналізм і адказнасць: кіраўніцтва — за калектыў, а кожнага з работнікаў — за свой участак працы



Дырэктар ААТ «Велікасельскае Агра» Васіль СЕВАСЦЬЯНЧЫК.

**ААТ «Велікасельскае Агра» ўпэўнена ўваходзіць у топавы спіс «малочных каралёў» Брэсцкай вобласці. У рэспубліканскім рэйтынгу з многіх соцень гаспадарак па выніках першага паўгоддзя 2021-га прадпрыемства знаходзіцца на 43-м месцы па ўдоі на карову — і гэта вельмі добры вынік. Ад 98 да 100 % малака штогод здаецца на перапрацоўчыя прадпрыемствы сортам «экстра».**

Зрэшты, у «Велікасельскім Агра» не лічаць, што гэтым варта ганарыцца.

— З майго пункту гледжання, усё малако, па сутнасці, сорту «экстра», — тлумачыць **дырэктар ААТ «Велікасельскае Агра» Васіль СЕВАСЦЬЯНЧЫК.** — Карова ад прыроды запраграмаваная даваць толькі такое малако — чыстае і якаснае, якое сёння мы называем «экстра». Малако становіцца горшым, калі жывёл дрэнна даглядаюць, не ствараюць дастатковых умоў. Так што 100 працэнтаў малака «экстра» ў той ці іншай гаспадарцы, па маім глыбокім перакананні, — не дасягненне. Гэта проста азначае, што людзі здолелі не сапсаваць тое, што дадзена прыродай.

Не гнацца за імгненнай модай і не рабіць праблем з перашкод, якія сустракаюцца на шляху, а спакойна, удумліва і планамерна вырашаць пастаўленыя задачы — стыль жыцця і работы ў «Велікасельскім Агра». І, як паказвае практыка, гэты стыль кіраўніцтва вельмі эфектыўны.

— Залог поспеху — жаданне людзей рабіць сваю працу добрасумленна і адказна, з разуменнем таго, што робіш. Перакананы: каб працаваць у сельскай гаспадарцы, патрэбны талент, з гэтым трэба нарадзіцца, — кажа дырэктар. — На нашым прадпрыемстве ўсе галоўныя спецыялісты таленавітыя, кожны ў сваёй сферы, і кіруюць працэсамі так, каб ад кожнага работніка атрымаць максімум, на што здольны.

Што пасееш, тое і пажнеш — гэты прынцып датычыцца не толькі палявых работ, лічыць кіраўнік гаспадаркі. Укладаючы сродкі ў высокапрадукцыйную тэхніку і сучасныя тэхналогіі, атрымліваеш стабільна высокія ўраджаі. Укладаючы сілы, веды і вопыт у фарміраванне працоўнага калектыву, атрымліваеш моцную каманду прафесіяналаў.



Трактарыст Віталь ШАРАШОВЕЦ падчас уборкі буракоў з дапамогай камбайна Holmer.

## Стаўка на прафесіяналізм

Самаходны буракаўборачны камбайн HOLMER уражвае не толькі габарытамі, але і хуткасцю руху па полі. Мы не можам паспець за ім на легкавушцы. Магутная машына не мае патрэбы ў суправаджэнні трактара: камбайн скошвае бацвінне, выкопвае цукровыя буракі і ўкладвае іх у высокія, нашмат вышэйшыя за чалавечы рост, гурты. З пружанскіх палёў салодкая сыравіна адпраўіцца на Жабінкаўскі цукровы завод. Цукровыя буракі для гаспадарак Пружанскага раёна — культура стратэгічная. А яшчэ адна з найбольш працаёмкіх: уборка 300 га цукровых буракоў у «Велікасельскім Агра» ідзе не адзін дзень.

Аб'язджаючы шырокія палі і вытворчыя аб'екты ААТ, мімаволі звяртаеш увагу на багацце прыгожых маладых твараў. І на пазітыўны настрой калектыву прадпрыемства. За пультам кіравання магутнага кормаўборачнага камбайна — **механізатар Пётр ШЫРМА:** работа на дарагой, складанай сучаснай тэхніцы — гэта давер калектыву, высокая ацэнка майстэрства.

— Сярэдні ўзрост нашых супрацоўнікаў — да 40 гадоў, — расказвае Мікалай Ляўчук. — А ўзрост галоўных спецыялістаў — і ўвогуле да 30. Галоўнаму інжынеру — трыццаць, галоўнаму аграному — трыццаць, галоўнаму бухгалтару яшчэ не споўнілася дваццаці пяці... Нельга сказаць, што гэта пазіцыя кіраўніцтва — неяк само так атрымліваецца, што да нас прыходзіць сур'ёзная, працавітая, таленавітая моладзь.

**Аператар перапрацоўкі збожжа Дзмітрый ХОДАК** працуе на камбікормавым заводзе ААТ «Велікасельскае Агра» разам са стрыечным братам Віталём. Удваіх яны абслугоўваюць досыць буйную, цалкам аўтаматызаваную вытворчасць, а **кіроўца Міхаіл ВАБІШЧЭВІЧ** развозіць камбікорм па малочных комплексах. Абодва — і Віталь, і Дзмітрый — хлопцы мясцовыя. Адслужылі ў войску, вярнуліся ў родныя мясціны і вырашылі застацца жыць і працаваць на малой радзіме.

— Вядома, сельскагаспадарчая праца заўсёды была і застаецца, нягледзячы на мадэрнізацыю вытворчасці, дастаткова цяжкай, складанай і адказнай. Не заўсёды бывае гладка, але мы спраўляемся. Асабіста мяне ўсё задавальняе: і праца, і заробак, і ўмовы, якія створаны для работнікаў, — кажа Дзмітрый.

Галоўнае, падкрэслівае ён, у сельскай гаспадарцы чалавек ведае, дзеля чаго працуе, і бачыць вынікі сваіх намаганняў.



Спецыяліст па ідэалагічнай рабоце Мікалай ЛЯЎЧУК дэманструе склад па захоўванні кармоў.



Рабочы дзень на малочна-таварным комплексе «Вялікае Сяло № 2».



Кіроўца па адвозцы камбікармоў Міхаіл ВАБІШЧЭВІЧ.

## Адкуль цякуць малочныя рэкі

Гаспадарка спецыялізуецца на малацэ: пагалоўе дойнага статка ААТ «Велікасельскае Агра» — 2950 кароў. У складзе прадпрыемства працуюць два цалкам камп'ютарызаваныя малочна-таварныя комплексы. Летась прадпрыемства выйграла конкурс ААТ «Банк развіцця» па фінансаванні будаўніцтва малочна-таварных ферм, і з красавіка пачата ўзвядзенне яшчэ аднаго сучаснага комплексу на тысячу галоў дойнага статка. На новай ферме будзе ўстаноўлена абсталяванне кампаніі DeLaval — сусветнага лідара ў распрацоўцы сучасных тэхналогій для малочнай жывёлагадоўлі. У мінулым годзе з адной каровы на прадпрыемстве было атрымана 8900 тысяч літраў малака, па выніках гэтага года гаспадарка плануе выйсці на паказчык у дзевяць тысяч.



Намеснік дырэктара па жывёлагадоўлі Андрэй ІВАНОЎ.

«Велікасельскае Агра» цалкам забяспечвае сябе кармамі, і гэта зніжае сабекошт малака, расказалі спецыялісты. Прадпрыемства гатова да зімы:

— На сёння мы ўжо нарыхтавалі 40 цэнтнераў кармавых адзінак травяністых кармоў на ўмоўную галаву, — адзначае кіраўнік.

Вось ужо два гады ў гаспадарцы працуе ўласны камбікормавы завод. Галоўны заатэхнік распрацоўвае рэцэптуры для кожнай групы жывёл, якія гнутка змяняюцца ў залежнасці ад таго, цёпла ці холадна на вуліцы, ад этапу жыццёвага цыкла, самаадчування і нават смакавых пераваг жывёл.

— Інгрэдыентаў для камбікармоў досыць шмат, асноўныя — кукуруза і гарох, шраты, кармавыя дабаўкі, соль і цукар, — тлумачыць **спецыяліст па ідэалагічнай рабоце Мікалай ЛЯЎЧУК.** — Для вытворчасці малака асабліва важны збалансаваны састаў кармоў. Прытым ён пастаянна абнаўляецца, таму ў нас добрыя надоі.

## Калі дробязяў не бывае

Вытворчыя паказчыкі ў «Велікасельскім Агра» растуць практычна штогод. Леташняе жніво адзначылася для сельгаспрадпрыемства рэкорднымі вынікамі. Але і ў гэтым годзе, нягледзячы на капрызы надвор'я, вынікі ўборачнай кампаніі парадавалі калектыў і кіраўніцтва.

— 2020 год быў найлепшым па ўраджаі збожжавых і каласавых культур: мы атрымалі максімум за ўсю гісторыю гаспадаркі — 65 цэнтнераў з гектара, — расказвае Васіль Лявонцьевіч. — Ну, а 2021-ы аказаўся стандартным у шэрагу астатніх гадоў — з ураджайнасцю 47 ц/га.

Зараз на палях гэтай буйной гаспадаркі (яе плошча — дзевяць тысяч гектараў, працягласць — каля 40 кіламетраў) у разгары ўборка кукурузы і цукровых буракоў. Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы надвор'я ўраджай атрыманы добры. Сярэдняя ўраджайнасць кукурузы на сілас склала 430 ц/га, а 130 ц/га — на збожжа.

— Сёлета моцна падсушыла яравыя і збожжавыя. Напэўна, просты абывацель, які жыве ў горадзе і не мае дачынення да сельскай гаспадаркі, чытаючы гэтыя радкі, цяпер у душы іранічна ўсміхнуўся: вось зноў аграрыі ўсё на надвор'е звальваюць, — кажа кіраўнік «Велікасельскага Агра». — Але, як бы нам ні хацелася гэта змяніць, у сельскай гаспадарцы нават з улікам сучасных тэхналогій умовы надвор'я адыгрываюць вырашальную ролю.

Хоць адпрацаваныя тэхналогіі вырошчвання сельскагаспадарчых культур і якасная сучасная тэхніка могуць зрабіць гэты ўплыў мінімальным. Калектыў ААТ «Велікасельскае Агра» з году ў год даказвае гэта на практыцы.

— На працягу апошніх трох гадоў у абнаўленне машынна-трактарнага парка (кормаўборачная тэхніка, прычапное абсталяванне, трактары, збожжаўборачныя камбайны) мы ўкладваем да мільёна еўра штогод. І на наступны год у нас такія ж планы, — дзеліцца Васіль Лявонцьевіч. — Скарачэнне колькасці работнікаў у сельскай гаспадарцы — працэс, на які мы не можам паўплываць. Насельніцтва старэе, моладзь пераязджае ў гарады — сёння больш прэстыжна быць айцішнікам, чым трактарыстам. Значыць, патрэбна высокапрадукцыйная і надзейная сучасная тэхніка: яна дарагая, але сябе акупляе.



Аператары працэсу перапрацоўкі збожжа Дзмітрый ХОДАК і Віталь ХОДАК за работай.



Уборка травы на полі.



Камбайнер Аляксандр МАРДАНЬ займаецца рамонтам тэхнікі.



Супрацоўнікі ААТ «Велікасельскае Агра»:
Ганна СМУСЯНОК, Яна СЯМАШКА, Анастасія ШУЛЬГА, Кацярына ГРЫГАРОВІЧ, Таццяна ПАНЧУК, Алеся КАБРЫНЕЦ, Галіна КАРАЛЬЧУК, Валянціна ЯНУШКЕВІЧ, Ірына ЛАПУКА, Галіна КАРАВАЙ і галоўны бухгалтар Вераніка ШУМАК.

## Простыя ісціны

— Галоўная задача кіраўніка — стварыць найлепшыя ўмовы для работы калектыву, — кажа Васіль Севасцьянчык. — Калі сельгаспрадпрыемства не здольнае забяспечыць людзям стабільнасць і ўпэўненасць у заўтрашнім дні, наўрад ці яно можа разлічваць, што на яго палях і малочна-таварных комплексах будуць працаваць адукаваныя, высокапрафесійныя кадры. Але мы са свайго боку стараемся рухацца менавіта ў гэтым кірунку. І шмат чаго ўжо дамагліся. Умовы працы ў нас камфортныя, тэхніка сучасная, заработная плата прыстойная (у сярэднім — парадку 1470 рублёў). Бо для любога чалавека ў прыярытэце — дабрабыт яго сям'і.

Калектыў (а ў ААТ «Велікасельскае Агра» працуе больш за 300 чалавек) тут зладжаны, цякучкі кадраў няма. За гады існавання прадпрыемства сфармавалася сістэма арганізацыі працы, дзе безадказныя і абыякавыя да сваіх абавязкаў людзі проста не прыжываюцца. Васіль Севасцьянчык кажа, што мае ўсе падставы па праве ганарыцца сваім працоўным калектывам — прафесіяналамі, адданымі агульнай справе.

Але, па словах дырэктара, тут рады добрым спецыялістам — планы велізарныя, а рабочых рук у сельскай гаспадарцы заўсёды не хапае.

— Патрабаванні да работнікаў простыя: адукаванасць у сваёй справе, адказнасць і сумленнасць, — падкрэслівае дырэктар.

Што ж прапануе добраму спецыялісту ААТ «Велікасельскае Агра»? Перш за ўсё — камфартабельнае жыллё.

— Чаргі тых, хто мае патрэбу ў жыллі, у нас няма. Добрыя, утульныя дамы з газавым ацяпленнем мы будуем пастаянна. Сёлета тры новыя дамы атрымалі спецыялісты заветэрынарнай службы.

Падчас палявых работ гарачыя абеды і вячэры працаўнікам палёў — цалкам за кошт гаспадаркі. Усе спецыялісты прадпрыемства забяспечваюцца медыцынскай страхоўкай і абслугоўваюцца ў медыцынскіх цэнтрах Брэста за кошт наймальніка. Паводле калектыўнага дагавора, да ўсіх значных дат (вяселле, юбілей, нараджэнне дзіцяці), а таксама да сумных падзей (пахаванне блізкіх сваякоў) і, вядома, да свят работнікам тут выплачваецца матэрыяльная дапамога — 20 базавых велічынь. А нядаўна кіраўніцтвам ААТ «Велікасельскае Агра» было прынята рашэнне зацікавіць людзей у добраахвотнай вакцынацыі, і цяпер кожнаму, хто прышчапіўся ад ковіду, прадпрыемства выплачвае па 150 рублёў.

Акрамя таго, спецыяліста чакае работа ў маладым таленавітым калектыве і практычна неабмежаваныя магчымасці кар'ернага росту. І, нарэшце, экалагічна чысты рэгіён і зносіны з добрымі, сардэчнымі людзьмі. Бо Вялікае Сяло і яго наваколлі — гэта самае сэрца Палесся. Частка палёў гаспадаркі знаходзіцца на тэрыторыі Белавежскай пушчы.

— Быў час, на нашых палях «пасвіліся» дзікі, елі кукурузу і наносілі шкоду. Цяпер сталі прыходзіць радзей, затое кожную зіму з тэрыторыі пушчы панадзіліся выходзіць на палі зубры, есці рапс і азімыя, — з усмешкай расказалі нам. — Тады нашы механізатары выязджаюць у поле, некалькі машын становяцца ў рад і пачынаюць сігналіць. Зубры палохаюцца і ўцякаюць у суседнюю гаспадарку. А калі іх гоняць адтуль, вяртаюцца да нас. Так і ганяем іх усю зіму, — смяецца суразмоўца.

Што ж, мінусаў і зусім няма, адны плюсы? — спытаеце вы. Але ў тым і асаблівасць мясцовага характару, што любыя мінусы тут здольныя ператварыць у плюсы.

— Школа ў нас дзевяцігадовая, — кажа Васіль Лявонцьевіч. — Але Пружаны — усяго за пятнаццаць кіламетраў, туды ходзіць аўтобус, і практычна ў кожнай сям'і ёсць асабісты аўтамабіль: падвезці дзіця ў школу — не праблема. А калі дзяцінства вашага сына ці дачкі пройдзе на ціхай вуліцы, а не ў шумным загазаваным горадзе, мне здаецца, гэта хутчэй плюс, чым мінус. І потым, на мой погляд, калі ў класе трыццаць вучняў і адзін настаўнік, гэта не вучоба. Іншая справа — калі на аднаго настаўніка — тры-пяць вучняў. Гэта ж практычна індывідуальныя заняткі! І зусім іншы ўзровень засваення ведаў. А горад — вось ён, побач, з усімі плюсамі: і лядовы палац, і басейн, і кіно, і кафэ, і вялікія магазіны: можна заказаць любую дастаўку. Так што нашы людзі не адчуваюць сябе на ўскраіне свету. Наадварот: я перакананы, гэта найлепшае месца для жыцця і працы, найлепшы куток краіны, каб гадаваць дзяцей і радавацца плёну сваёй працы. Напярэдадні Дня работнікаў сельскай гаспадаркі хачу пажадаць усім супрацоўнікам ААТ «Велікасельскае Агра» моцнага здароўя і дабрабыту — ім самім і іх сем'ям. Мы ведаем, што нам рабіць, каб быць паспяховымі і багатымі. Таму галоўнае — здароўе. Калі яно будзе, астатняга мы даможамся сваёй працай, ведамі і прафесіяналізмам.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ, АЛЕНА ДАЎЖАНОК. ФОТА АЛІНЫ МАЗАВЕЦ.**

УНП 200026870



У сталовай «Велікасельскага Агра». На фота — кухонныя работнікі Ірына ДАРАФЕЮК і Ганна КАРЫМАВА, кухар Юлія ПАЦЯРУХА (пасярэдзіне).

# СА ЗМЕНАЙ ПАКАЛЕННЯЎ ТРАДЫЦЫІ ЗАСТАЮЦЦА



## Больш за паўстагоддзя ўпэўненасць у заўтрашнім дні дае калектыву ў паўтары сотні чалавек вясковая птушкафабрыка



Токар Іван ЯКІМОВІЧ і дырэктар Тэрэса ДЫБУЛЬ.

**Сёлета ААТ «Аранчыцкая птушкафабрыка» адзначыла сваё 55-годдзе. Вядома, цяперашняе прадпрыемства зусім не падобнае на тое, што існавала тут у далёкія 1960-я гады. Абноўлена вытворчая база і тэхніка, выкарыстоўваюцца сучасныя тэхналогіі і формы работы. Нязменнымі застаюцца традыцыі: касцяк калектыву і абсалютную яго большасць складаюць тутэйшыя жыхары, якія даражаць работай і шануюць прадпрыемства. Крыху больш за 10 гадоў фабрыку ўзначальвае Тэрэса ДЫБУЛЬ. З ёю наша сённяшняя гутарка.**

— Звычайна, калі атрымліваю якую-небудзь узнагароду, а сёлета, напрыклад, мы атрымалі Гран-пры рэспубліканскага конкурсу спажывецкіх пераваг «Прадукт 2020 года», кажу абсалютна шчыра, што за гэтым стаіць праца ўсяго калектыву, — пачынае размову Тэрэса Валяр'янаўна. — Так яно і ёсць: калектыў са 131 чалавека забяспечвае работу птушкафабрыкі на 220 тысяч галоў птушкі. Прадпрыемства па сённяшніх мерках невялікае, але галоўная яго адметнасць — стабільна працуе і, як цяпер кажуць, устойліва развіваецца. Сярэдняя зарплата па выніках мінулага года склала амаль 900 рублёў. Любы чалавек, які ведае сітуацыю ў сельскай гаспадарцы, скажа, што гэта прыстойны паказчык. Зарплата ў нас ніколі не затрымліваецца. Як запісана ў калектыўным дагаворы, так і выплачваецца: строга па чыслах месяца. Людзі ўжо прывыклі размяркоўваць свае траты: плацяжы па крэдытах, узносы за вучобу дзяцей, іншыя абавязковыя выплаты, іх можна рабіць рэгулярна і ў тэрмін.



Юрысконсульт Вераніка СУМІЧ.

**— Для любога працаўніка дзве найважнейшыя пазіцыі — зарплата і жыллё. Пра зарплату ўжо было сказана. А якая сітуацыя з жыллём? Ці ёсць перспектывы ў маладых спецыялістаў справіць наваселле?**

— Вядома, жыллё заўсёды было вырашальным фактарам для замацавання кадраў. За апошнія паўтара дзясятка гадоў у нас больш за 20 дамоў пабудавана для членаў калектыву. Выкарыстоўваем усе магчымасці, каб забяспечыць працаўнікоў квадратнымі метрамі. Двум спецыялістам купілі кватэры ў Пружанах. Гэта аказалася больш выгадным, чым узводзіць дом. Падлічылі, што за адзін дом выходзіць фактычна дзве двухпакаёвыя кватэры. А некалькі гадоў таму паспрабавалі купляць вясковыя дамы, рабіць рамонт, рэканструкцыю. Цяпер гэта ўвайшло ў практыку. Вось і нядаўна прыехала на работу малады спецыяліст, яе маладой сям'і выдзелілі менавіта такі дом. Купіць вясковую хату, правесці там водаправод, каналізацыю, ацяпленне, зрабіць рамонт — усё роўна атрымліваецца нашмат танней, чым будаваць з нуля. І людзі задаволены, што жыллёвае пытанне вырашаецца хутка.

**— Не выпадае здзіўляцца, што ў вас шмат працоўных дынастый, а ў некаторых работнікаў за ўсю працоўную дзейнасць фактычна адзін запіс у працоўнай кніжцы.**

— У нас так адбываецца, што бацькі нярэдка прыводзяць на работу дзяцей. І такім прэтэндэнтам, несумненна, аддаецца перавага. Сапраўды, ёсць працоўныя дынастыі. Некалькі гадоў таму галоўным інжынерам стаў спецыяліст, бацькі якога шмат гадоў адпрацавалі на фабрыцы.

Наогул, стараюся браць мясцовых. У асяродку сваіх знаёмых, сваякоў, аднавяскоўцаў сорамна працаваць дрэнна. Ва ўчарашніх школьнікаў ёсць стымул мабілізаваць асабістыя рэзервы і паказаць сябе дарослым сур'ёзным працаўніком перад сваімі ж суседзямі. За гады работы давodзілася праводзіць на пенсію спецыялістаў і рабочых, якія адпрацавалі на фабрыцы больш за 30 гадоў. Рабіць гэта вельмі няпроста. Людзі перажылі самыя складаныя часы прадпрыемства. А былі такія ў канцы 1990-х — пачатку 2000-х, не звольніліся, не з'ехалі ў горад. І пры гэтым захавалі пачуццё адказнасці за работу, за яе якасць і яшчэ нешта вельмі важнае, што цяжка выказаць словамі, але на чым трымаецца калектыў, можа, яго своеасаблівы маральны стрыжань. Таму і ўзнікалі такія пачуцці падчас праводзінаў на пенсію.

На шчасце, традыцыі фабрыкі захоўваюцца і са зменай пакаленняў. Ёсць многа працаўнікоў, якія перажываюць за работу, здольны бачыць не толькі за паўметра ад сябе. Магу назваць такіх у кожным падраздзяленні прадпрыемства, у нас ёсць цудоўныя птушніцы, майстры сваёй справы — зваршчык, токар. Ды што там гаварыць! На прыбіральшчыцу нашу Ірыну Маргунову варта звярнуць увагу. Яна перайшла сюды з другога ўчастка па стане здароўя. Ірына Мікалаеўна падтрымлівае чысціню нібы ў сябе дома. З пачаткам пандэміі ёй ніхто не гаварыў, што ручкі ў дзвярах кабінетаў трэба праціраць дэзрастворам кожную гадзіну. Яна сама адсочвае рэкамендацыі санітарнай службы і праводзіць дэзінфекцыю. Проста радуешся часам за людзей, за іх стаўленне да справы.

**— Якая сістэма стымулявання працаўнікоў дзейнічае на прадпрыемстве?**

— Вой, я не так даўно ўзнагароду ад прафсаюза атрымала за наш калектыўны дагавор і наогул за стаўленне да чалавека працы. У нас выгадна працаваць доўга і добра. Скажам, для тых, каму застаецца пяць гадоў да пенсіі, дзейнічае накапляльны фонд. За ўказаны адрэзак часу збіраецца пэўная сума, якой чалавек можа распарадзіцца сам: забраць яе адразу альбо атрымліваць штомесяц як невялікую прыбаўку да пенсіі. Распрацаваны і дзейнічаюць сістэмы страхавання і стымулявання. Работнікі атрымліваюць выплаты як пасля дасягнення пенсійнага ўзросту, так і ў юбілейныя даты, пры ўступленні ў шлюб і пры нараджэнні дзіцяці. Матэрыяльная дапамога аказваецца на аздараўленне, на нарыхтоўку агародніны і бульбы, работнікі атрымліваюць па 60 яек на месяц бясплатна. У каго ёсць падсобная гаспадарка, выдзяляецца сена за палову цаны. Дзейнічае разгорнутая сістэма падтрымкі сям'і. Даюцца сацыяльныя гарантыі маладым рабочым і спецыялістам. Усё для таго, каб чалавек адчуваў сябе абароненым і з задавальненнем раніцай ішоў на работу.

## МАЙСТАР СПРАВЫ І АЎТАРЫТЭТ

Не маглі мы не пазнаёміцца з чалавекам-легендай Аранчыцкай птушкафабрыкі **токарам Іванам ЯКІМОВІЧАМ.** Дырэктар Тэрэса Дыбуль сказала, што гэта спецыяліст і працаўнік рэдкі: «Колькі захоча Іван Фёдаравіч працаваць, столькі будзе: узрост яму не памеха. Мала таго, што ён спецыяліст, якіх пашукаць, дык яшчэ непараўнальны дыпламат, настаўнік моладзі. Ён ніколі не павысіць голас, не выкажа эмоцый, спакойна так падыдзе да трактарыста, скажа нібы мімаходзь: «Не так, Міша, ты гэта робіш». І таму Мішу ці Ваню адразу сорамна стане паўтараць свае памылкі, адным словам, сваёй добразычлівасцю, шчырым клопатам пра справу здабыў аўтарытэт наш Фёдаравіч».

— Працую 40 гадоў на фабрыцы, а ўсяго працоўны стаж маю больш за 50 гадоў, — гаворыць Іван Фёдаравіч. — Ужо, можа, і хапіла б працаваць. Падумаў так, як пачалася пандэмія, ды звольніўся. Але не ўседзеў дома. Цяжка застацца раптам без справы. Аказваецца, я ўжо люблю гэты калектыў, люблю работу. Маладым сапраўды трэба часам падказваць. Быў у маёй практыцы выпадак, калі малады трактарыст за месяц работы знішчыў новы матор толькі таму, што яму ніхто не падказаў, як ва ўмовах пыльнай работы, а ў полі яна заўсёды пыльная, трэба кожны дзень здымаць фільтр і прачышчаць яго. Цяпер не забываемся лішні раз нагадваць ім, навічкам.... А кіраўніцтва фабрыкі нібы думкі мае прачытала. Запрасілі выйсці, ну і выйшаў летам, можа, яшчэ трошкі папрацую. Хоць і дома ёсць чым заняцца: агарод, гаспадарка, унукі летам прыязджаюць.

## ПРАЦОЎНЫЯ ПЛАНЫ ЗВЯЗВАЮЦЬ З ФАБРЫКАЙ

Сярод спецыялістаў птушкафабрыкі мы сустрэлі нямала маладых людзей. Некаторыя ўжо працуюць галоўнымі спецыялістамі, ёсць і маладыя спецыялісты-пачаткоўцы. Вераніка Яшкявічус на пасадзе заатэхніка другі год. Дзяўчына са Столінскага раёна, пасля заканчэння Ляхавіцкага аграрнага каледжа прыехала ў Аранчыцы па размеркаванні. Паводле слоў дырэктара прадпрыемства, з першых дзён паказала сябе ўдумлівым, адказным працаўніком, актыўным, нераўнадушным чалавекам. Адразу вырашыла павышаць сваю кваліфікацыю і паступіла завочна ў Віцебскую ветэрынарную акадэмію.



Заатэхнік Вераніка ЯШКЯВІЧУС каля помніка яйку.

— Работа мне падабаецца, — сказала Вераніка. — За год я пазнаёмілася з усімі людзьмі. У калектыве мне камфортна. Паколькі я прыехала з мужам, фабрыка выдзеліла дом, які раней набылі ў жыхара вёскі і капітальна адрамантавалі. Сваю далейшую працоўную біяграфію бачу тут, няма жадання нечага шукаць, недзе пераязджаць. Наш населены пункт блізка ад райцэнтра. Сацкультбыт тут даволі развіты. Дзіцячы садок у нас, відаць, найлепшы ў раёне, калі яго загадчыца нядаўна стала ганаровым грамадзянінам Пружанскага раёна.



Галоўны заатэхнік Эдуард ПАШКЕВІЧ, начальнік цэха кормавытворчасці Алена ЧАПЯЛЕВІЧ і аграном Раман ЛІТВІНОВІЧ кантралююць выгрузку корму.

**Галоўнага агранома Рамана ЛІТВІНОВІЧА** ўдалося застаць на машынным двары, куды ён заехаў з поля, дзе ўбіраецца кукуруза.

— Маем 401 гектар зямлі, зараз нам выдзелілі яшчэ невялікі кавалак былых зямель сельгаспрадпрыемства «Ліноўскае». Вырошчваем розныя культуры для вытворчасці камбікорму, — гаворыць Раман Аляксандравіч. — Для вітаміннага корму патрэбныя кукуруза, люцэрна, іншыя шматгадовыя травы, паступова павялічваем пасевы рапсу. Свае кармы атрымліваць выгадна.

**Галоўны інжынер Раман ТРОНЕЦ** таксама з маладога пакалення спецыялістаў, на фабрыцы працуе чатыры гады. Яго гаспадарка — цэх механізацыі, які налічвае зараз 10 трактароў плюс аўтамабільны парк. Інжынер не без гонару гаворыць, што тэхніка ўся адносна новая. Вось і два гады таму набылі трактар МТЗ 3522 — гэта ўдасканаленая мадэль нашага «Беларуса». Узялі да яго шэраг агрэгатаў. Цяпер магутная машына замяняе адразу некалькі.



Галоўны інжынер Раман ТРАНЕЦ у сваім кабінеце.

— Некалькі аўтамабіляў купілі нядаўна для развозу прадукцыі. Камбайн набылі ў лізінг, зараз маем два камбайны. Надзейная тэхніка — залог поспеху любой работы на полі, — падсумоўвае інжынер. — Ёсць свая рамонтная майстэрня для бягучага рамонту.

## Фірменны гандаль

**Тамара ХІЛЬКОВІЧ,** як і многія на гэтым прадпрыемстве, сумяшчае тры пасады: **старшыня прафкама, інжынер па якасці і таваравед.**



Інжынер па якасці, старшыня прафкама Тамара ХІЛЬКОВІЧ і прадавец Святлана ІЛЫЧ у магазіне птушкафабрыкі.

— У нас ёсць тры фірменныя крамы, дзе рэалізоўваем сваю прадукцыю, — гаворыць Тамара Іосіфаўна. — Адзін невялікі магазін тут, на фабрыцы, адзін — у Пружанах, адзін — у Брэсце, таксама арандуем два павільёны ў Бярозе і два гандлёвыя пункты на рынках Кобрына, ёсць арэндныя месцы на рынку ў Брэсце. Такім чынам, каля 10 працэнтаў сваёй прадукцыі рэалізоўваем праз уласныя гандлёвыя сеткі. Кожныя выхадныя выязджаем на рынкі ў Белаазёрск і ў Маларыту, абавязкова ўдзельнічаем у асенніх кірмашах, адным словам, ідзём да свайго спажыўца.

**— Прапаную пагаварыць, як і за кошт чаго атрымліваецца прыбытак, іншымі словамі — як ствараецца дабрабыт прадпрыемства.**

— Сёння Аранчыцкая птушкафабрыка працуе рэнтабельна, без даўгоў і вялікіх крэдытаў. Большую частку прадукцыі рэалізоўваем у сваёй краіне, частка ідзе на экспарт у Расію. Мы спецыялізуемся на вытворчасці яйка. Самі гадуем курэй з сутачнага кураняці, якое купляем на Мінскай птушкафабрыцы. Самі атрымліваем прадукцыю, самі знаходзім спажыўцоў і развозім ім тавар. Пра якасць дбаем заўсёды. Нашы кліенты — школы агульнаадукацыйныя і санаторныя, бальніцы, дамы-інтэрнаты, вайсковыя часці, іншыя сацыяльныя ўстановы. Якасць у нас на першым плане, інакш быць не можа. Каб падтрымліваць сваю марку, клапоцімся пра экалагічна чыстыя кармы, працуем з тымі камбікормавымі заводамі, прадукцыя якіх адпавядае нашым патрабаванням. Многа ёсць складнікаў, пра калектыў я ўжо гаварыла...

Разумная эканомія стала часткай стратэгіі. У нас амаль усе спецыялісты сумяшчаюць пасады. Ну не можа невялікае вясковае прадпрыемства дазволіць сабе ўтрымліваць асобную адзінку ў якасці эколага, намесніка па ідэалогіі, старшыні прафкама. Экалогіяй займаецца аграном, кадры вядзе работнік прыёмнай і гэтак далей. У нас усе ўсвядомілі, што грошы мае той, хто ўмее іх лічыць.

Лічым кожную капейку, узважваем свае магчымасці. У крэдыты не ўлазім, дзесяць разоў не пралічыўшы. Маем 400 гектараў ворыўных зямель, але гэтага мала для забеспячэння кармавой базы, таму купляем збожжа. Ёсць грошы, бяром адразу многа і па перадаплаце, так атрымліваецца значна танней.

За апошнія гады праведзена рэканструкцыя фактычна ўсёй вытворчасці, — працягвае Тэрэса Валяр'янаўна. — Памятаю, як дырэктарам-пачаткоўцам адразу ўвязалася ў будоўлю. У 2013 годзе пачалі перарабляць яйкасклад. Тады вельмі дапамог тагачасны старшыня райвыканкама Аляксандр Юркевіч. Набраўшыся вопыту, пакрысе правялі абнаўленне ўсіх памяшканняў фабрыкі. Поўнасцю памянялі машынна-трактарны парк, вось і нядаўна дзве новыя машыны купілі для перавозкі прадукцыі.

Навучыліся працаваць ва ўмовах сезоннасці попыту. Рэч у тым, што з канца вясны рэалізацыя прадукцыі падае. Школьныя сталоўкі не працуюць, у бальніцах становіцца менш пацыентаў, людзі едуць у адпачынак, менш робяць пакупак у магазіне. Стараемся падладжвацца пад запыты рынку, як той казаў, круціцца. Скажам, за мінулы год валавы збор яек склаў 65 з паловай мільёна. Ад кожнай курыцы мы атрымалі ў сярэднім па 300 яек. Гэта і ёсць наша выручка. Тэмп яе росту ў параўнанні з папярэднім годам склаў 106,2 працэнта.

**— За час нашай гутаркі заўважыла: пра якія вытворчыя паказчыкі ні заходзіць размова, вы ўсё роўна выводзіце на людзей. Відаць, кожнага са 130 працаўнікоў ведаеце асабіста?**

— І не толькі ў твар, але і гісторыю яго сям'і, працоўную біяграфію. А яшчэ даўно прыйшла да высновы, як важна падтрымліваць карпаратыўны дух. Раней, да пандэміі, некалькі разоў праводзілі ў кастрычніку свята-фестываль, калі адзначаецца Міжнародны дзень яйка. Да фестывалю рыхтаваліся. Кожны цэх, кожнае падраздзяленне мела сваю праграму: песні, танцы, стравы, прэзентацыі. І людзі раскрываліся па-новаму. Ніхто, напрыклад, не ведаў, што сталага ўзросту зваршчык цудоўна выконвае рамансы, а працаўніца склада наогул артыстка. І не толькі пры падрыхтоўцы свят праяўляюць актыўнасць і знаходлівасць. Многія ўдзельнічаюць у раённых турзлётах, спартыўных спаборніцтвах, днях рыбака. І гэта важна. Скажам, кіроўцы не бачаць адзін аднаго ў працэсе работы, кожны едзе ў сваім напрамку. А дзень рыбака дае магчымасць для нефармальных стасункаў. У нас ёсць пераможцы спартыўнай эстафеты, найлепшыя сандружынніцы, самадзейныя артысты і паэты. Пры падрыхтоўцы аднаго з мерапрыемстваў нашы заўзятары вынайшлі шмат навукова-папулярнай інфармацыі пра яйка. Звесткі сапраўды цікавыя, выкарыстоўваем іх у працэсе работы.

Думаю, вашым чытачам таксама будзе цікава даведацца, што адно яйка па пажыўнасці раўназначна 50 грамам мяса і 120—150 грамам малака. Яйка забяспечвае на пяць працэнтаў сутачную патрэбу дарослага чалавека ў бялках, тлушчах, мінеральных рэчывах і на 10 працэнтаў у асноўных вітамінах. Для сілкавання нервовай сістэмы і мозгу яйка пераўзыходзіць ікру, сметанковае масла, малако, а спецыфічны бялок цудоўна ўмацоўвае сэрца і сценкі сасудаў. Гэта незаменны прадукт у здаровым харчаванні чалавека любога ўзросту. Так што ешце нашы аранчыцкія яйкі, і будзеце здаровыя!

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
**Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Аліны МАЗАВЕЦ.**

УНП 200026018.



Трактарысты-машыністы сельскагаспадарчай вытворчасці Сяргей КАРНОЎ і Пятро ПУНЬКО займаюцца падрыхтоўкай тэхнікі перад пастаноўкай на захоўванне.



Зваршчык 7-га разраду Алег ПАРЭЧЫН рамантуе экскаватар.



Аўтапарк ААТ «Аранчыцкая птушкафабрыка».



Дырэктар РУП «Брэсцкая АСГДС НАН Беларусі» Уладзімір ЦІМОШЧАНКА паказвае саджанцы аднагодкі яблыні.

# СКЛАДНІКІ ПОСПЕХУ

## Гаворым з навукоўцамі Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Брэсцкая абласная сельскагаспадарчая доследная станцыя Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» аб сучасных тэхналогіях у раслінаводстве і іншых складніках поспеху сельгаспрадпрыемства

**Прыкмета трэцяга тысячагоддзя — стаўка на «разумныя тэхналогіі» ў любой сферы народнай гаспадаркі, якія і забяспечваюць уражлівы вынік. І сельская гаспадарка — не выключэнне.**

На дзвярах лабараторыі — папярэджанне: «Староннім уваход забаронены!»: тут асаблівыя патрабаванні да стэрыльнасці. У мерыстэмнай лабараторыі Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Брэсцкая абласная сельскагаспадарчая доследная станцыя Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» на металічных паліцах шчыльнымі радамі стаяць прабіркі. У кожнай — мініяцюрны жывы зялёны кусцік.



Галоўны аграном Аляксандр ЗЯМЛЯНІК каля ўраджаю кукурузы.

— Гэта клубніцы, — тлумачыць **навуковы супрацоўнік аддзела пладаводства доследнай станцыі Таццяна КАБРЫНЕЦ.** — Вось гэта агрэст. Тут — бясшыпная ажына. А вось — спецыяліст паказвае яшчэ на шэраг прабірак — клонавыя прышчэпы яблыні і грушы. Бульбу зараз не пакажам — мы закупляем у Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па бульбаводстве і плодаагародніцтве» зыходны матэрыял пад Новы год, за тры месяцы са ста прабірак «разганяем» да ста тысяч і потым высаджваем у цяпліцы.

Перад намі — свайго роду зялёная «радзільня». У стэрыльным пажыўным растворы (у яго складзе — 25 соляў) падрастаюць парасткі, якія навукоўцы і называюць «мерыстэма». З гэтых маленькіх кусцікаў спецыялісты вырасцяць паўнавартасныя расліны. Але ў чым сутнасць метаду? У атрыманні бязвіруснага пасадачнага матэрыялу. Кожная расліна, якая пачала жыццё ў гэтай лабараторыі, пройдзе два важныя этапы: лабараторны і палявы. Мерыстэму размножаць, яна саспее ў прабірцы і адправіцца на доследныя ўчасткі. У выніку вялікія гаспадаркі, а таксама фермеры і дачнікі атрымаюць да новага цёплага сезона элітны насенны матэрыял бульбы, кусцікі клубніцы, ажыну і буякі.



Прабірачная расліна суніц садовых (клубніц).

Навуковы супрацоўнік Таццяна КАБРЫНЕЦ.

— Чым добры метад культуры тканін? У адрозненне ад вегетатыўнага размнажэння, дзе ёсць сезоннасць, мы можам атрымаць любую патрэбную колькасць раслін да любога вызначанага тэрміну, — кажа спецыяліст. — А можам захоўваць мерыстэму ў халадзільніку і год, і два, а потым размножыць у патрэбны момант, атрымаўшы суперэлітныя расліны.

Плюсы мерыстэмнага размнажэння ўжо ацанілі практыкі сельскай гаспадаркі — попыт на саджанцы і пасяўны матэрыял, выраблены тут, стабільна перавышае прапанову. Штогод мерыстэмная лабараторыя выпрабляе больш за 100 тысяч прабірачных раслін бульбы і дзясяткі тысяч пладова-ягадных клонавых прышчэпаў.

Асаблівая ўвага — «другому хлебу». Кусцікі бульбы з прабірак высадзяць у цяпліцы і атрымаюць міні-клубні. Цяпліцы таксама з'яўляюцца закрытай зонай — інфекцыя не павінна трапіць на першае клубневае пакаленне. А на другі год (ужо ў палявых умовах) навукоўцы атрымаюць паўнавартасны высокапрадукцыйны насенны матэрыял, які запатрабаваны ў гаспадарках раёна і за яго межамі. У тым ліку ў Расіі, краінах СНД і нават у далёкай Сербіі. Ураджайнасць сартоў бульбы, што культывуюцца доследнай станцыяй, — 500 ц/га і вышэй.

— Бульба ў нас — беларускіх сартоў. «Скарб», «Брыз», «Маніфест», «Нара», «Здабытак», «Першацвет», «Зорачка», «Лілея» — асартымент уражлівы, — кажа **дырэктар доследнай станцыі Уладзімір ЦІМОШЧАНКА.** — Прапрацоўваем пытанне аб увозе з Уладзікаўказа мерыстэмных раслін еўрапейскіх сартоў. Гэта дазволіць атрымаць насенны матэрыял бульбы, які хочуць нашы фермеры. Хоць асабіста мне па смакавых якасцях бліжэй айчынныя сарты.



Загадчыца біяхімічнай лабараторыі Ірына ЛУКША і намеснік дырэктара па навуцы Віктар ХАЛЕЦКІ ў лабараторыі.



Цяпліцы Брэсцкай абласной сельскагаспадарчай доследнай станцыі НАН Беларусі.

### І ДАСЛЕДАВАННІ, І ЎРАДЖАЙ

Сфера адказнасці самай паўднёвай сельскагаспадарчай доследнай станцыі краіны — перш за ўсё навуковыя даследаванні. У штаце прадпрыемства — старшыя і малодшыя навуковыя супрацоўнікі, тры кандыдаты сельскагаспадарчых навук. Кіраўнік станцыі — вядомы селекцыянер, дацэнт, у мінулым доўгія гады працаваў у Гродзенскім аграрным універсітэце. У актыве Уладзіміра Цімошчанкі — тры аўтарскія сарты: два — азімай пшаніцы, «Веда» і «Зарыца», і сорт азімага трыцікале «Жыцень». Ёсць уласныя сарты і ў даручанага яму прадпрыемства.

— Мы займаемся рознымі культурамі — збожжавымі, зернебабовымі, крупянымі, пладовымі і ягаднымі, а таксама кармавымі, — расказвае **намеснік дырэктара па навуковай рабоце Віктар ХАЛЕЦКІ.** — Напрыклад, вынік нашай працы па вывядзенні высокапрадукцыйных сартоў лубіну белага — два перададзеныя на сортавыпрабаванне. Адзін створаны сумесна са спецыялістамі біялагічнага факультэта БДУ, другі — з Горацкай акадэміяй. Белы лубін раней у краіне не вырошчвалі. Гэта больш прадукцыйная кармавая культура ў параўнанні з традыцыйным для нашай сельскай гаспадаркі лубінам вузкалісным, яна лідзіруе па ўтрыманні бялку. У цэлым высокапрадукцыйныя кармавыя культуры — адзін з важных напрамкаў доследнай працы.



Вядучы інжынер па эксплуатацыі тэхналагічнага абсталявання Аляксандр КУДРЭЙКА з ураджаем яблыкаў.

Ёсць у прадпрыемства цяплічная гаспадарка (шэсць цяпліц пад бульбу, адна для ягадных культур і яшчэ адна, абсталяваная сталамі) і шэсць лабараторый. Але, акрамя гэтага, у доследнай станцыі — 564 га раллі і 146 га шматгадовых насаджэнняў (у тым ліку больш за 100 га пладовага саду). І барацьбу за ўраджай невялікі калектыў станцыі вядзе нароўні з буйнымі суседзямі.

— У гэтым годзе, калі казаць аб выніках уборкі, нам няма на што скардзіцца. Па ўраджайнасці бульбы мы пакуль лідзіруем у Пружанскім раёне, — адзначае Уладзімір Рыгоравіч. — Па збожжавых у гэтым годзе чацвёртыя ў раёне. Стабільна трэці год запар па ўраджаі збожжавых мы ідзём уверх, штогод дадаючы працэнтаў 30—40 да ўраджайнасці.



Навуковы супрацоўнік Ірына ЛАДЫГА дэманструе бульбу сорту «Брыз».

### ВІТАМІНЫ НА КОЖНЫ СТОЛ!

Бульбасховішча прадпрыемства месціць дзве тысячы тон, пладасховішча — 1200 тон, і зараз абодва запоўненыя практычна на 100 працэнтаў адборнай прадукцыяй. Не пустуюць і насенняводчыя склады — тоны насення збожжавых, зернебабовых, крупяных культур высокіх рэпрадукцый чакаюць сваёй гадзіны: з пачаткам вясны яны будуць рэалізаваны гаспадаркам. Захоўванне насеннага матэрыялу і сельгаспрадукцыі наладжана на сучасным узроўні, боксы аснашчаны прыладамі аўтаматычнага кантролю мікраклімату. Невыпадкова менавіта на складах доследнай станцыі знаходзіцца раённы стабілізацыйны фонд бульбы. Кантэйнеры з «другім хлебам» застануцца тут да вясны, а пасля пачнуцца адгрузкі пакупнікам. І духмяныя яблыкі таксама праляжаць усю зіму — увесну вітаміны будуць дарэчы і беларускім, і расійскім спажыўцам.

Яшчэ адзін напрамак работы прадпрыемства — вырошчванне саджанцаў пладова-ягадных культур. Тут можна набыць матэрыял для закладкі саду на прысядзібным або дачным участку, але асноўныя кліенты — гэта буйныя сельгаспрадпрыемствы.

— Штогод мы вырабляем каля 100 тысяч саджанцаў пад заказ, — адзначае **аграном аддзела садаводства Святлана ТРУС.** — Вырошчваем пасадачны матэрыял пладова-ягадных культур, матачнікі клонавых прышчэпаў костачкавых і семечкавых культур.

106 гектараў пладаноснага саду прадпрыемства — гэта калекцыя з 39 пладовых сартоў. У прыватнасці, дзясяткі найбольш запатрабаваных сёння гандлёвымі сеткамі сартоў яблыкаў — як еўрапейскай, так і беларускай селекцыі. А таксама «дзівацтвы», якія, здавалася б, у нашым клімаце не растуць: ад чарэшні да персікаў, нектарынаў і грэцкіх арэхаў.

Вырошчвае прадпрыемства таксама агародніну і бахчавыя культуры — ураджай кавуноў тут стабільна высокі. Агародніна і садавіна, выгадаваныя гаспадаркай, пастаўляюцца ў дзіцячыя садкі, школы, іншыя ўстановы адукацыі, у санаторыі Пружанскага раёна і іншых раёнаў Брэстчыны.

Плодаагароднінная прадукцыя з палёў Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Брэсцкая абласная сельскагаспадарчая доследная станцыя Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» запатрабаваная і ў Беларусі, і за мяжой. У прыватнасці, яблыкі на перапрацоўку адгружаюцца на два расійскія заводы — у Санкт-Пецярбургу і пад Ліпецкам. Таварныя яблыкі ручнога збору можна ўбачыць у шматлікіх крамах Расіі. Сёлета 15 тон сліў таксама былі прададзеныя ўсходняму суседу. Ну, а паказчыкам экалагічнасці і якасці пладовай прадукцыі тут лічаць супрацоўніцтва з вядомым брэндам дзіцячага харчавання «Таптыжка».

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ,**
**Алена ДАЎЖАНОК, фота Аліны МАЗАВЕЦ.**

УНП 200027213



Збор ураджаю яблыкаў.



Захоўванне бульбы на экспарт.

Пульт кіравання бульбасховішчам.



Аграном аддзела садаводства Святлана ТРУС *(справа)* і рабочая Вольга КОРСАК на зборы яблыкаў.

# Узнагароды — за прыгажосць



**Конкурс «Найлепшы падворак» на прыгожае і нестандартнае добраўпарадкаванне ўласнай сядзібы праводзіцца ў раёне не ўпершыню. Але кожны год ён адкрывае новыя імёны цікавых і творчых гаспадароў, якія ўмеюць ператварыць няхай і невялікі прыдамавы ўчастак у прывабны, квітнеючы куток.**

Вынікі конкурсу меліся падвесці ў пачатку восені, але з-за ковідных абмежаванняў урачыстасці пераносілі. І ўрэшце рэшт мерапрыемства правялі пазней у райвыканкаме, куды запрасілі пераможцаў, каб уручыць ім заслужаныя ўзнагароды. На гэты раз ушанавалі тры маладыя сям'і-пераможцы. Дыпломам трэцяй ступені адзначана сям'я Генадзя і Кацярыны Велікасельцаў з вёскі Стараволя. Паводле слоў **старшыні Велікасельскага сельвыканкама Таццяны НАВІЦКАЙ,** дом Кацярыны і Юрыя выдзяляецца ў Старавалі мноствам кветак, арыгінальнымі клумбамі. Маладыя гаспадары самі адрамантавалі яго і зрабілі перапланіроўку.

За другое месца ўзнагароду атрымалі Віктар і Сняжана Аліфірук з вёскі Калядзічы. Падворак дома шматдзетнай сям'і ўпрыгожаны малымі архітэктурнымі формамі, тут ёсць і вятрак, і сімвал радзімы бусел. А першае месца камісія прысудзіла Маргарыце і Вадзіму Рудчыкам з Навасёлак. Паводле слоў **начальніка аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі Аляксандра МОМЛІКА,** прыгажосць, зробленая іх рукамі, стала славутасцю ўсёй вёскі.

У конкурсе гаспадароў прыватных сядзіб перамогу адсвяткавалі Галіна Якімавец з Калядзічаў, Міраслава Капіца з Клепачоў, Валянціна Бульчук з Муравы.

Былі адзначаны таксама пераможцы конкурсу сярод прадпрыемстваў і арганізацый. У іх ліку ПМК-21, сярэдняя школа № 1 райцэнтра, Ліноўскі яслі-садок, Шарашэўская школа.

**Старшыня райвыканкама Юрый БІСУН** пры ўручэнні ўзнагарод адзначыў, што добраўпарадкаваннем падворка, вытворчай тэрыторыі гэтыя гаспадары паляпшаюць сваю малую радзіму, а значыць, робяць прыгажэйшым навакольны свет, і заклікаў усіх брацц з іх прыклад.

**Яна СВЕТАВА.**




## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: **ОАО «АП г. Барановичи»** (УНП 290237319), 225417, г. Барановичи, ул. Тельмана, 102-2, тел. +375 (163) 68-18-91.

Публичные торги в электронной форме будут проведены **30 ноября 2021 г. с 09.00 до 17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

Предмет торгов – Автопоезд (Автомобиль грузовой седельный тягач MAZ 5440 M9, 2018 г. в., инв. № 55050, гос. № АМ 6442-1; полуприцеп платформа тентовая MAZ 9755830-3061, 2018 г. в., инв. № 55150, гос. № А 5934 Е-1). Начальная цена предмета торгов – 132 542,15 бел. руб. с НДС. Местонахождение – г. Барановичи, ул. Тельмана, 102-2. Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 18.11.2021 г. с 09.00 по 29.11.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY;** 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов: не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Минский мясокомбинат» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже **изолированного помещения, наименование – магазин с инв. № 500/D-1003744 общей площадью 543,7 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 500000000003001058 площадью 0,3585 га (право постоянного пользования, доля в праве 7/100) по адресу: г. Минск, тракт Игуменский, 47-2н.**

*Объект обременен договором аренды по 31.07.2025.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **1 256 850,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **125 685,00** бел. руб.). Начальная цена снижена на 14,5 %.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 2 (двух) процентов. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звезда» от 27.07.2021, 28.09.2021, 22.10.2021. Аукцион состоится **23.12.2021 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 22.12.2021 до 16.00** по указанному адресу **в каб. 320. Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.**

УНП 100003394

Блізкая ўлада

# ЯК ЛЯЧЫЦЬ ЗУБЫ ІНВАЛІДУ ПЕРШАЙ ГРУПЫ?

**З такім пытаннем звярнуліся да старшыні Віцебскага аблвыканкама Мікалая ШАРСНЁВА падчас прамой тэлефоннай лініі**



**Усяго ў мінулую суботу дазваніліся дваццаць чалавек. У чэрвені такіх было дваццаць чатыры. Традыцыйна шмат агучаных праблем датычыліся сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі.**

Падчас моцных дажджоў у пад'ездзе аднаго з пяціпавярховых дамоў па вуліцы Петруся Броўкі ў абласным цэнтры цячэ па сценах вада. Супрацоўнікі ЖКГ не вырашаюць гэтую даўнюю праблему.

Са жніўня бяжыць вада па стаяку ў кватэры жыхаркі вуліцы Герцэна. Падстава для адмовы ў рамонце — дэфіцыт паветра для зварачнага апарата. Мікалай Шарснёў даручыў кіраўніку гарадской выканаўчай улады аператыўна дапамагчы чалавеку і высветліць, хто вінаваты ў валакіце. Жыхары Віцебска скардзіліся таксама на ледзь цёплыя батарэі цэнтральнага цеплазабеспячэння ў кватэрах. З Сянно паведамілі пра бруд на вуліцах.

Праблема іншага плана — складанасці пры лячэнні зубоў даросламу інваліду першай групы. Кіраўнік галоўнага ўпраўлення аблвыканкама па ахове здароўя абяцаў асабіста разабрацца ў сітуацыі і дапамагчы з арганізацыяй аказання стаматалагічнай дапамогі. Камітэтам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, дарэчы, прадугледжана магчымасць дастаўкі ў паліклінікі і іншыя ўстановы людзей, якія абмежаваны ў рухах.

Пенсіянерка з віцебскай вуліцы Гагарына выказала жаданне, каб паштовае аддзяленне працавала бліжэй да яе дому, як было раней. Незадаволенасць паштовым абслугоўваннем выказала і пенсіянерка з вёскі Рудні Полацкага раёна. Высветлілася, што там аддзяленне ўвогуле часова не працуе, бо не могуць знайсці работніка на палову стаўкі.

На работу судовых выканаўцаў паскардзіўся жыхар Оршы, які не можа атрымаць прыкладна палову сумы кампенсацыі ад вінаватай у смерці яго сына.

Чалавек, які дазваніўся з гарадскога пасёлка Сураж Віцебскага раёна, пацікавіўся магчымасцю пражывання ў пустым жыллі ў населеным пункце Светлы таго ж раёна.

Падводзячы вынікі прамой лініі, старшыня аблвыканкама звярнуў увагу на кадравую работу. Ён лічыць, што адказных асоб, якія не рэагуюць на скаргі людзей, трэба замяняць на прафесіяналаў, якія будуць ставіцца з увагай і павагай да кожнага чалавека і тым самым павышаць аўтарытэт улады.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ,**
**фота аўтара.**

Тонкасці прафесіі

# СУЧАСНЫЯ АНІСКІНЫ

## Якія паўнамоцтвы будуць мець участковыя згодна з новым заканадаўствам аб гвалце і наколькі зменіцца іх тэхнічнае аснашчэнне?

**Участковы інспектар — сёння адна з самых народных прафесій. І так было заўсёды: згадаць хаця б таго ж Аніскіна з вядомай кінастужкі. Яны не расследуюць злачынствы, рэдка калі ўдзельнічаюць у гучных затрыманнях, аднак, як правіла, менавіта да гэтых людзей звяртаюцца ў першую чаргу, калі прыйшла бяда.**



У вырашэнні якіх праблем дапамагаюць грамадзянам участковыя, дзе схавацца ад хатняга гвалту і што неўзабаве аблегчыць працу інспектарам, напярэдадні Дня ўтварэння службы ўчастковых інспектараў міліцыі расказаў **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення прафілактыкі галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі МУС палкоўнік міліцыі Сяргей КРАСУЦКІ**.

***— Сяргей Мікалаевіч, участковыя інспектары — найбольш адкрытыя прадстаўнікі міліцыі. Ці шмат задач стаіць перад імі?***

— Участковы — фігура шматзадачная. У першую чаргу гэта работа з людзьмі ў жылым сектары. Калі нешта адбываецца на адміністрацыйным участку інспектара, участковы — першы супрацоўнік, які выбывае на месца здарэння. Задзейнічаны ўчастковыя і на ахове грамадскага парадку. Гэта і пастаянная работа з тымі, хто стаіць на прафілактычным уліку ў міліцыі. Інспектар рэагуе на звароты людзей. Я заўсёды кажу: калі не ведаеце, куды звярнуцца са сваім пытаннем, падыдзіце да ўчастковага. Ён вызначыць, ці патрэбна дапамога праваахоўнікаў, або накіруе ў адпаведную інстанцыю. Мы вызначылі адзіны дзень, калі ўсе ўчастковыя нашай краіны ажыццяўляюць прыём грамадзян: па серадах з 10.00 да 13.00 (для сельскіх участковых), з 17.00 да 20.00 (для гарадскіх).

***— Функцыі ўчастковага інспектара, на першы погляд, павінен выконваць чалавек з пэўным жыццёвым вопытам. А ці давяраеце гэты адказны ўчастак работы ўчарашнім выпускнікам Акадэміі МУС?***

— Сярод участковых інспектараў у прынцыпе няшмат супрацоўнікаў, хто заканчваў Акадэмію МУС. У большасці яны прыйшлі да нас з грамадзянскіх ВНУ. Сярод супрацоўнікаў — і тыя, хто ўжо адолеў пэўны шлях у міліцыі. Напрыклад, у патрульна-паставой службе. Маладыя людзі атрымліваюць вопыт у працэсе сваёй службовай дзейнасці. Я прайшоў такі ж шлях, у пэўны час скончыўшы грамадзянскую ВНУ. Вось ужо 25 гадоў маё жыццё звязана з міліцыяй.

***— Ці памяняліся з таго часу праблемы, вырашэннем якіх займаецца ўчастковы інспектар?***

— Якія праблемы былі, такія і засталіся. Наша грамадства глабальна не памянялася. Першая праблема — п'янства, з-за якога адбываецца большасць правапарушэнняў і злачынстваў, сямейных няшчасцяў. Другая праблема, якая таксама выходзіць з п'янства, — сямейна-бытавыя канфлікты. Гэта дзве болевыя кропкі для ўчастковага інспектара міліцыі. І спадзявацца на тое, што яны знікнуць з нашага грамадства, не варта.

***— Асабліва шмат злачынстваў апошнім часам звязана з хатнім гвалтам. Ці ў кампетэнцыі ўчастковага іх папярэдзіць?***

— Сёння мы называем гэтую праблему гвалтам у сям'і. Раней падчас сямейнага канфлікту мы забіралі правапарушальніка ў міліцыю, давалі яму штраф або садзілі на суткі. Чалавек вяртаўся дахаты — і сітуацыя паўтаралася. Сёння мы карыстаемся не толькі рычагамі ўздзеяння адміністрацыйнага заканадаўства, але можам і развесці бакі канфлікту на пэўны тэрмін, каб людзі да 30 сутак не мелі зносін паміж сабой. Калі пацярпелы хоча ацаніць сваю сітуацыю, то ў кожным раёне створаны прытулак, куды чалавек можа сысці, каб вырашыць пэўныя праблемы, а таксама прыняць рашэнне аб далейшым сумесным пражыванні. Сёння створана шмат рычагоў не толькі каб прымяніць выключна санкцыйныя меры, але і паспрабаваць вырашыць сямейную сітуацыю іншым шляхам пры дапамозе псіхолагаў, сацыяльных работнікаў, іншых зацікаўленых асоб. Аднак гэты механізм недасканалы. Ужо прынятыя ў першым чытанні змены ў законе «Аб прафілактыцы правапарушэнняў», якія датычацца папярэджання гвалту ў сям'і. Сёння на гэтую праблему трэба рэагаваць аператыўна. Мы прапанавалі канкрэтызаваць функцыі ўсіх суб'ектаў прафілактыкі, а таксама ўвесці новую працэдуру, такую як карэкцыйная праграма, што прадугледжвае аказанне дапамогі грамадзяніну, які здзяйсняе хатні гвалт. Спадзяёмся, што парламентарыі нас падтрымаюць.

***— Участковы павінен быць і добрым псіхолагам...***

— Ён проста абавязаны ім быць. Стандартных сітуацый, на жаль, не бывае. І часта правільнае слова або дзеянне інспектара можа спыніць той ці іншы бок, каб канфлікт не развіўся ў крытычную сітуацыю. Нашы супрацоўнікі рэагуюць на ўсе паведамленні, злачынствы і здарэнні, а на тым баку — людзі, з якімі неабходна размаўляць. І трэба дакладна разумець, як гэта рабіць.

***— Наколькі падрыхтаваныя супрацоўнікі да сустрэч з неадэкватнымі асобамі?***

— Каб пазбегнуць непрыемных сітуацый, наведваць жылыя памяшканні інспектар абавязаны разам з напарнікам. Участковы павінен быць адпаведным чынам і экіпіраваны. Сёння ўсе нашы супрацоўнікі маюць пры сябе відэарэгістратары, якія ўключаюць пры рэагаванні на пэўную канфліктную сітуацыю.

***— А ці гэтак жа добра абсталяваны тэхнічнымі сродкамі сельскія ўчастковыя?***

— Усе правілы распаўсюджваюцца і на інспектараў, якія працуюць у сельскай мясцовасці. Больш за тое, вясковыя ўчастковыя нават у некаторай ступені выйграюць: у многіх ёсць яшчэ і службовы аўтатранспарт. Для гарадскіх участковых гэта хутчэй выключэнне.

***— Многія супрацоўнікі міліцыі скардзяцца на вялікую колькасць папяровай работы...***

— Лічбавізацыя работы ўчастковага інспектара міліцыі — адна з перспектыў нашай дзейнасці. У найбліжэйшай будучыні той масіў работы, які праводзіць інспектар, ён выканае з дапамогай планшэта. Пад рукой у яго будуць і базы даных.

***— Ці шмат сярод участковых жанчын?***

— Улічваючы той кантынгент, з якім у большасці выпадках даводзіцца працаваць участковым інспектарам, гэта не зусім жаночая прафесія. Участковаму часта трэба і характар праявіць, а дзесьці — і сілу. Жанчыны-ўчастковыя ёсць, але іх няшмат: мы іх беражом.

**Вераніка КАНЮТА.**

Спажывец

# ПАЧЫМ КАПУСТА З ПАЛЯНДВІЦАЙ?

## Сельскагаспадарчыя кірмашы сёлета пакуль не развіталіся з намі

**Сезон восеньскіх сельскагаспадарчых кірмашоў скончыўся ў беларускай сталіцы і за яе межамі. Традыцыйныя восеньскія кірмашы стартавалі ў Мінску ў сярэдзіне верасня, на іх сельгасвытворцы з усіх куткоў краіны прапанавалі жыхарам сталіцы сваю прадукцыю. Сёлета ў Мінску працавалі 15 гандлёвых пляцовак ва ўсіх раёнах горада. Кропкі гандлю размешчаны, у прыватнасці, каля «Чыжоўка-Арэны», у парку Дружбы народаў і іншых папулярных месцах. У мінулыя выхадныя яны закрывалі сезон. Якую прадукцыю можна было набыць там, па якіх цэнах — даведаўся карэспандэнт газеты «Звязда».**

Вопытныя фермеры кажуць: вырасціць прадукцыю — палова справы, галоўнае — выгадна рэалізаваць. Традыцыйныя сезонныя сельскагаспадарчыя кірмашы — выдатная для гэтага магчымасць. У кожным раёне для гандлю вызначаюць прыдатныя лакацыі, а ў сталіцы выбіраюць агульнагарадскую — самую вялікую пляцоўку — на Ташкенцкай, 19. Старт гандлю далі 18 верасня, фінішаваў марафон па закупках 14 лістапада.

Свой багаты ўраджай прадаўцы прывозяць з розных куткоў краіны, апетытныя экзэмпляры з задавальненнем прэзентуюць усім пакупнікам.

Амаль кіламетровы кірмаш разгарнуўся на вуліцы Чкалава, каля Палаца чыгуначнікаў. Гандлёвыя шэрагі здаваліся бясконцымі. Трэба як мінімум паўгадзіны, каб ахапіць увесь асартымент: прайсціся, разгледзець, параўнаць.

На вуліцы Ясеніна, у раёне 5-й гарадской паліклінікі, шмат тавараў ручной працы: брошкі, кольцы, шкарпэткі, шапкі, апрацоўчыя дошкі, посуд і шмат чаго іншага. Праўда, гандаль у такіх прылаўках ідзе сціпла. Выключэнне — прапанова з ахоўнымі маскамі на твар. Незвычайныя з вышыўкай, каляровым прынтам і ўдалым кроем разыходзяцца як гарачыя піражкі з печкі.

Не саступае ў маштабах і сезонны кірмаш, што разгарнуўся на праспекце Ракасоўскага, 114. Яркія гарбузы, прамяністы мёд, традыцыйная бульба і далікатэсныя каўбасы. Дарэчы, такога асартыменту вясковых мясных ласункаў, як на гэтых сельгаскірмашах, не ўбачыш нідзе.

— Я ў мінулым швачка, — пакуючы чарговую прададзеную павязку, распавядае прадавец Галіна. Жанчына з Мінска, ёй прыкладна 60 гадоў. — Выручка за дзень хоць і невялікая — сярэдні кошт масак — 3 рублі, — але за дзень набягае прыемная дабаўка да пенсіі. Каля 50 рублёў. Запас масак вялікі, але калі скончацца, у мяне і фартухі ёсць, і рукавічкі.

Самы папулярны прадукт кірмашоў — бульба. Вось і на Ясеніна расклалі важкія мяшкі агародніны. Знайсці можна і па 70 капеек за кілаграм. Прадаюць звычайна сеткамі. У іх месціцца прыкладна 30 кілаграмаў. Але часцей за ўсё за бульбу просяць 1 рубель 20 капеек. Прыемны бонус — з некаторымі прадаўцамі можна дамовіцца, каб важкую куплю прывезлі да вас дадому.

На кірмашы поспехам карыстаюцца і буракі, бяруць кілаграмамі: на боршч, тушэнне і кансервацыю. Стабільным попытам карыстаюцца і разнастайныя марынады: агуркі, часнок, аджыка, таматы.

З веданнем справы гандлюе пажылы мужчына, што прадае журавіны. Цуда-ягада, па яго словах, зберажэ ад усяго і ў першую чаргу ад ковіду. Тавар прывезлі аж з Браслаўскіх азёр, прадаюць па 8 рублёў 50 капеек за кілаграм. Чаргі няма, але настойлівы маркетынг час ад часу прыцягвае ахвотных аздаравіцца.

— Частку засахару і адпраўлю ў маразілку, а другую пушчу на кампот, — дзеліцца планамі Пятро. Ён, вядома, часты госць кірмашоў. Любіць прыцаніцца, параўнаць якасць прадуктаў. — Уважліва глядзець трэба не толькі за цэнамі, але і за грамоўкай. Крыху далей журавіны прадаюць у латках па 6 рублёў. Пытаеш — і высвятляецца, што ў латку 600 грамаў. Атрымліваецца, што больш выгадна браць журавіны за 8 рублёў 50 капеек за кілаграм.

На сонцы пераліваецца мёд: вадкі лугавы (9 рублёў за 700 грамаў) або грэчкавы (14 рублёў за кілаграм), разнатраўе (15 рублёў за кілаграм), у сотах (кавалачак з выгляду на 300 грамаў за 4 рублі 80 капеек). Побач размясціліся і арэхі. Дарэчы, хатні грэцкі можна знайсці па 5 рублёў за кілаграм, кедравы — 20 рублёў за кілаграм.

Асартымент кірмашовых прылаўкаў цешыць вока, ёсць усё: ад сезоннай агародніны да дзіўных сувеніраў ручной работы і вязаных шапак.

Яўген прывез велізарны асартымент прадукцыі: памідоры, яблыкі, агуркі, квяцістая капуста, сліва, баклажаны, шынкі, зеляніна, перцы, рэдзька, буракі, бульба. Словам, чаго там толькі няма! Сам мужчына жыве на Магілёўшчыне, а прадукцыю



вырошчвае ў Гродзенскай вобласці. Дапамагаюць родныя.

— Аграрным бізнесам займаюся амаль чвэрць стагоддзя! Ведаю, якога тавару трэба ўзяць пабольш, а якога — паменш. Цяпер добра бяруць капусту, моркву на квашанне... Вядома, у пашане бульба. Памідоры і агуркі ў асноўным закупляюць на салаты, у невялікіх аб'ёмах. Цяпер на іх цэннік падняўся: усё ж грунтавыя віды адышлі, амаль усе — з цяпліцы, — уводзіць у курс справы Яўген.

Самы вялікі сталічны кірмаш традыцыйна праходзіць каля «Чыжоўка-Арэны». Тут за 12 выхадных дзён рэалізавалі больш за 500 тон плодаагароднінай прадукцыі, свой тавар прывезлі каля 3700 прадаўцоў. Вядома, лідар продажаў — бульба. Жыхары сталіцы папоўнілі свае запасы на 200 тон гэтай агародніны, на 55 тон морквы, 55 тон яблыкаў, 50 тон буракоў, 44 тоны капусты.

Кірмаш каля «Чыжоўка-Арэны» ў адрозненне ад іншых раённых (а іх усяго, нагадаю, дзевяць) праходзіць па два выхадныя дні запар, а не толькі па суботах. Ужо на падыходзе да яго бачыш людзей з тачкамі, што цягнуць пакупкі. Хтосьці грузіць у багажнікі машын, іншыя з цяжкасцю зацягваюць пару пудоў у асноўным агароднінай «здабычы» ў грамадскі транспарт.

Частка кірмашу — шэрагі райпо з усёй краіны, іншых дзяржарганізацый, якія гандлююць у асноўным мясам і мяснымі прадуктамі. Цэны адрозніваюцца. Напрыклад, «Мінскі халадакамбінат» прадае філе індычкі па 15,59 рубля, паляндвіцу — па 12,78 рубля, курынае філе — па 9 рублёў, галёнку — па 5,46 рубля, тушку качаняці — па 6,58 рубля, свіную печань — па 2,27 рубля, а набор для булёну — па 2,19 рубля.

У суседнім халадзільніку: бараніна — 16,59 рубля, індычка — 9,59 рубля, грудзінка бескасцёвая — 11,49 рубля, карэйка — 15,99 рубля, рэбры — 7,99 рубля.

Сенненскае райпо прапануе па акцыі фарш з мяса птушкі — па 9,55 рубля, фарш «Мінскі» — 9,98 рубля, курыную каўбасу з салам — па 11,50 рубля і галубцы — па 6,99 рубля. Без акцыі ёсць ялавічына для смажання — 18,72 рубля, «кулінарная» — 14,07 рубля, свініна для гарачага — 12,66 рубля, «апетытная» — 14,42 рубля, для адбіўных — 15,97 рубля, для шашлыку — 14,36 рубля, «па-сялянску» — 8,80 рубля.

Нятанна сёння прыкупіць і гародніну. Практычна ўся яна па параўнанні з леташнім сезонам падаражэла. А калі ўспомніць цэны 3-4-гадовай даўнасці, калі складана было знайсці хоць што-небудзь з хадавой гародніны з цэннікам вышэй за рубель, то становіцца ясна, як змянілася «баршчовая» інфляцыя. Мяркуйце самі: бульба на кірмашы каштавала тады 25—35 капеек, буракі і морква — 30—50 капеек, цыбуля — 35—60 капеек, капуста — 25—35 капеек, памідоры — ад 80 капеек да 2,5 рубля, перац — ад 1 да 2,5 рубля, агуркі — 2-3 рублі, яблыкі — ад 40 капеек да 2,5 рубля, грушы — ад 80 капеек да 2 рублёў, журавіны — 3,4—4 рублі, мёд — 6—14 рублёў.

Сёння практычна ўсе цэны пачынаюцца ад рубля. Бульба — 0,7—1,2 рубля, капуста — 1—1,2 рубля, морква — 0,8—1 рубель, буракі — 0,8—1 рубель, цыбуля — 0,8—1,2 рубля, памідоры — 2—4,5 рубля, перац — 2—4,5 рубля, агуркі — 4-5 рубля, яблыкі — 0,8—2,5 рубля, грушы — 1,5—6 рублёў, журавіны — 8-9 рублёў, мёд — 9—18 рублёў, часнок — 3,5—8,5 рубля, пекінская капуста — 2—2,5 рубля, квяцістая — 1,5—4 рублі, кавун — 0,7—1 рубель, чарнасліў — 3 рублі, вінаград — 3—4,5 рубля.

Хэлаўін прайшоў, вось чаму за гарбузы просяць куды менш, чым тыдні два таму, — 0,5—1,5 рубля за кілаграм. Шампіньёнамі гандлюе на здзіўленне ўсяго некалькі чалавек, цана — ад 5,5 да 7 рублёў.

На вагу прадаюць і гарбату — амаль усе варыянты па 5-6 рублёў, але ёсць і па 9 рублёў — «Ройбуш» — «чайны хмызняк, без кафеіну». «Маскоўская гарбатная кампанія», — тлумачыць паходжанне тавару прадавец. Пасля чаго назвы не выклікаюць здзіўлення («Пырскі шампанскага», «Імператарскі», «Кацярына Вялікая»...).

Крыху воддаль Кацярына з Сенніцы прадае саленні і салёныя грыбы — хоць і дорага, але асартымент уражвае. Баравікі — 49 рублёў за кілаграм, груздзі — 30 рублёў, рыжыкі — 45 рублёў, апенькі — 27 рублёў, масляткі — 30 рублёў. «Даражэй за райпоўскія, таму што ў мяне кожны грыб прамыты, якасна пасолены. Займаюся я імі не першы год і езджу па шматлікія віды ў розныя раёны Мінскай вобласці. Па рыжыкі — аж пад Старыя Дарогі, па баравікі — ва Уздзенскі», — распавяла жанчына.

Тут жа прадаюць жывую рыбу: сом — 9,00—9,80 рубля, шчупак — 7,70—8,20 рубля, амур — 6,37—6,90 рубля, карп — 4,95—6,50 рубля, таўсталобік — 4,50—4,90 рубля, карась — 1,65—3,74 рубля.

Праз дзясятак метраў можна ў адным месцы купіць і свойскае мяса, і хлеб хатняй выпечкі (па 2 рублі) — з сялянскай гаспадаркі з Баранавіцкага раёна. «Без цукру», — удакладняецца на цэтліку.

Не сказаць, каб «салодкімі» былі цэны на кансервы беларускіх вытворцаў — іх перакупнік спрабуе прадаць даражэй, чым яны каштуюць у сеткавых крамах. Напрыклад, свініну — за 3,80 рубля, а ялавічыну — за 3,20 рубля.

А вось чаго ў «сеткавіках» не купіш — дык гэта эксклюзіўных хатак (за 100—130 рублёў) і ляжанак (20—30 рублёў) для катоў-сабак. Гэтай незвычайнай справай Мікіта займаецца нядаўна, усяго год таму. «Кот з'явіўся. Зрабіў яму домік, людзі сталі прасіць зрабіць ім такія ж, і я ўцягнуўся. Зараз аформіўся як рамеснік, раблю домікі, — часцей на заказ. Варыянты афармлення любыя. Цяпер вось «авакада» дарабляю», — адзначыў мужчына.

Непадалёк раскладзеныя лазневыя венікі: дубовы каштуе 5 рублёў, ядлаўцовы — 4 рублі, можна прыкупіць невялікія вязаначкі палыну і святаянніку — усяго па 2 рублі. «Павесіш у лазні, і, калі пойдзе пара, водар будзе шыкоўны», — нахвальвае тавар прадавец.

Ну а калі адпачыць хочацца адразу пасля блукавання па гандлёвых радах, то можна і шашлыку (свіны — 4,90 рубля, курыны і з перапёлкі — па 4 рублі за 100 грамаў) з глінтвейнам (18 %, 5 рублёў за 300 грамаў) спажыць, «не адыходзячы ад касы».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

***P.S.*** *Ужо пасля таго, як матэрыял быў падрыхтаваны да друку, стала вядома, што сезон работы восеньскіх кірмашоў у Мінску падоўжаны да 5 снежня ўключна.*

**Извещение о проведении электронных торгов**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5 |
| **Продавец** | Минское областное потребительское общество, г. Минск, ул. Бровки, 24 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46 |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**

**Здание торгового центра** (здание специализированное розничной торговли) общей площадью 3109,6 кв. м, инвентарный номер 600/С-100734, составные части и принадлежности: подвал, площадка.
Адрес: **Минская обл., Минский р-н, Сеницкий с/с, аг. Сеница**

**Сведения о земельном участке:** общей площадью 0,5973 га предоставлен на праве постоянного пользования для размещения объектов розничной торговли

**Начальная цена с НДС 20 % – 3 455 610,00 бел. руб.**

**Обременения:** площади здания частично сданы в аренду. Здание торгового центра находится в залоге у ОАО «Белагропромбанк». Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 1,5 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона.

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов: 20.12.2021 в 13.00** **Окончание торгов: 20.12.2021 в 14.00** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 17.12.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу:** www.ipmtorgi.by |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

**ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ № 2**

**На строительство объекта:** «Строительство жилого микрорайона в г. Смолевичи (микрорайон Липки)». II очередь строительства. Индивидуальные жилые дома, КПП, ограждение территории. I пусковой комплекс.».

**Информация о застройщике**

**Застройщик:** производственно-строительное закрытое акционерное общество «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ» зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 08 ноября 2000 года № 1266 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100011299.

**Юридический (почтовый) адрес:** 220020, г. Минск, пр-т Победителей, 100-817.

**Режим работы для приема заявлений и заключения договоров:**
понедельник – пятница с 9.00 до 18.00.

**Производственно-строительное закрытое акционерное общество «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ» в качестве заказчика построило следующие объекты:**
- бизнес-центр Покровский, г. Минск пр-т Победителей, д. 100, нежилой фонд;
- многоквартирный жилой дом, г. Минск, ул. К. Чорного, д. 25, жилой фонд;
- санаторно-курортный комплекс «Плисса», Витебская область, Глубокский район, деревня Плиса, улица Гвардейская, дом 4, нежилой фонд.

**Перечень объектов, построенных за последних три года:**
- храм-памятник в честь Всех Святых, г. Минск, ул. Калиновского 121, нежилой фонд.

**Информация о проекте**

проектно-сметная документация прошла государственную экспертизу в установленном порядке, получено положительное заключение РУП «Госстройэкспертиза по Минской области» от 28.10.2020 г. N 1635-70/20.

Проектная документация разработана на основании разрешительной документации в составе:
- акт выбора места размещения земельного участка, предоставленного в постоянное пользование, утвержденного от 07.10.2019 г.;
- решение Смолевичского районного исполнительного комитета «О разрешении производственно-строительному закрытому акционерному обществу «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ» строительства объекта» от 17.11.2020г. № 2971;
- решение Смолевичского районного исполнительного комитета «О разрешении производственно-строительному закрытому акционерному обществу «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ» строительства объекта» от 18.05.2021г. № 1279.

Участок площадью 12,8621 га передан производственно-строительному закрытому акционерному обществу «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ» на основании договора аренды земельного участка от 22.11.2019 г. № 2272 для строительства жилого микрорайона. Свидетельство (удостоверение) от 02.12.2019 № 614/828-15837 о государственной регистрации земельного участка с кадастровым номером 624850100008000760.

Застройщиком по строительству объекта выступает производственно-строительное закрытое акционерное общество «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ».

Функции подрядчика индивидуальных жилых домов исполняет:
**по генплану № 54 (тип 4):** ООО «Формворк» договор № 1/07-21 от 30.07.2021г.
**по генплану № 55 (тип 5-1)** ЧУП «СУ № 61» договор № 1-30/04 от 29.04.2021г.
**по генплану № 56 (тип 3-2)** ООО «СибирияСтрой» договор № 14/06-21 от 14.06.2021г.
**по генплану № 57 (тип 5-2)** ЧУП «СУ № 61» договор № 1-30/04 от 29.04.2021г.
**по генплану № 58 (тип 5-1)** ООО «СибирияСтрой» договор № 16/04-21 от 16.04.2021г.
**по генплану № 59 (тип 3)** ЧУП «СУ № 61» договор № 1-30/04 от 29.04.2021г.
**по генплану № 60 (тип 3)** ПС ЗАО «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ»
**по генплану № 61 (тип 6)** ПС ЗАО «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ»
**по генплану № 64 (тип 7)** ООО «СибирияСтрой» договор № 11/12-20 от 14.12.2021 г.
**по генплану № 65 (тип 5)** ПС ЗАО «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ»
**по генплану № 66 (тип 5)** ПС ЗАО «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ»
**по генплану № 67 (тип 3-1)** ООО «СибирияСтрой» договор № 16/04-21 от 16.04.2021г.
**по генплану № 69 (тип 5-1)** ООО «СибирияСтрой» договор № 14/06-21 от 14.06.2021г.
**по генплану № 70 (тип 5-2)** ЧУП «СУ № 61» договор № 1-30/04 от 29.04.2021г.
**по генплану № 71 (тип 3-1)** ЧУП «СУ № 61» договор № 1-30/04 от 29.04.2021г.

**Местонахождение объекта:** в микрорайоне Липки г. Смолевичи.

**Цель строительства:** возведение индивидуальных жилых домов.

**Этапы и сроки строительства:**
- срок начала строительства объекта – I квартал 2021 г.;
- окончание строительства объекта – I квартал 2022 г.

**Характеристика объекта:** строительным проектом предусмотрено строительство жилого микрорайона в г. Смолевичи Минской область (микрорайон Липки) в количестве 85 индивидуальных жилых домов.

Общая площадь одноквартирного жилого дома по генплану № 54 (тип 4) составляет 200,71 кв. м, состоящего из 5 (пяти) жилых комнат общей площадью 117,83 кв. м В доме 2 этажа.

Общая площадь одноквартирного жилого дома по генплану №№ 55, 57, 58, 69, 70 (тип 5-1, тип 5-2) составляет 159,1 кв. м, состоящего из 4 (четырех) жилых комнат общей площадью 97,8 кв. м. В доме 2 этажа.

Общая площадь одноквартирного жилого дома по генплану №№ 56, 67, 71 (тип 3-1, тип 3-2) составляет 171,95 кв. м, состоящего из 5 (пяти) жилых комнат общей площадью 107,5 кв. м. В доме 2 этажа.

Общая площадь одноквартирного жилого дома по генплану №№ 59, 60 (тип 3) составляет 160 кв. м, состоящего из 4 (четырех) жилых комнат общей площадью 103,14 кв. м. В доме 2 этажа.

Общая площадь одноквартирного жилого дома по генплану № 61 (тип 6) составляет 126,6 кв. м, состоящего из 4 (четырех) жилых комнат общей площадью 80,28 кв. м. В доме 2 этажа.

Общая площадь одноквартирного жилого дома по генплану № 64 (тип 7) составляет 144 кв. м, состоящего из 6 (шести) жилых комнат общей площадью 106,5 кв. м. В доме 2 этажа.

Общая площадь одноквартирного жилого дома по генплану №№ 65, 66 (тип 5) составляет 161,9 кв. м, состоящего из 5 (пяти) жилых комнат общей площадью 105,88 кв. м. В доме 2 этажа.

Строительство объектов долевого строительства будет осуществляться в соответствии со строительным проектом и заключенными договорами создания объектов долевого строительства.

**По настоящей проектной декларации для категории граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальных предпринимателей, юридических лиц предлагаются для заключения договоров создания объектов долевого строительства следующие объекты долевого строительства:**

| Индивидуальный жилой дом, № по генплану | Стоимость 1 м², бел. руб. |
|---|---|
| № 54 (тип 4) | 2 066,00 |
| № 55;69 (тип 5-1) | 2 214,00 |
| № 56 (тип 3-2) | 2 165,00 |
| № 57;70 (тип 5-2) | 2 214,00 |
| № 58 (тип 5-1) | 2 214,00 |
| № 59;60 (тип 3) | 2 017,00 |
| № 61 (тип 6) | 2 214,00 |
| № 64 (тип 7) | 2 030,00 |
| № 65;66 (тип 5) | 2 017,00 |
| № 67;71 (тип 3-1) | 2 214,00 |

*Цены сформированы при условии 100 % оплаты*

- на индивидуальные жилые дома по генплану №№ 54, 55, 56, 57, 58, 59, 60, 61, 64, 65, 66, 67, 69, 70, 71 согласно проектной документации;

Для лиц, заключивших договоры создания объекта долевого строительства, цена 1 кв. м, определенная в договоре, является неизменной до окончания строительства. Плата за объект долевого строительства производится дольщиком в соответствии с графиком платежей.

По согласованию сторон допускается изменение порядка расчета по оплате объекта долевого строительства с заключением дополнительного соглашения к договору.

Состав общего имущества: внутриквартальная автодорога, тротуары, сети, освещение, внутриплощадочные сети, электро-, газо- и водоснабжение, канализация, элементы благоустройства.

Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходом работ по его строительству можно получить по адресу: 220020, г. Минск, пр-т Победителей 100-817 или по тел.: +37517 240-48-29; +37517 240-47-58.

Принятие и регистрация заявлений осуществляется с первого дня с даты публикации настоящей проектной декларации. Для подачи заявления необходимо личное присутствие гражданина и его паспорт.

По истечении 7 дней с даты публикации настоящей проектной декларации и до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству задекларированных индивидуальных жилых домов, производится заключение договоров долевого строительства. Для заключения необходимо личное присутствие дольщика и его паспорт.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 7 (семи) рабочих дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и застройщик оставляет за собой право заключить договор на заявленное помещение с другим претендентом.

**ЗАО «Центр промышленной оценки» информирует о переносе даты электронных торгов по продаже имущества ОАО «Белинвестбанк», опубликованных в газете «Звязда» 10.11.2021 г.**

**Дата и время проведения электронных торгов:** начало торгов – 14.00 **14.12.2021 г.** Окончание торгов – 15.00 **14.12.2021 г.** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by. **Заявления на участие принимаются по 10.12.2021** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42, www.cpo.by**

УНП 191021390

# «Камбустыялогія патрабуе трапяткога стаўлення да пацыента...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У напружаны пасляваенны час верагоднасць прымянення ядзернай зброі стварала ўмовы для бурнага развіцця апёкавай службы ва ўсім свеце. Савецкі Саюз не быў выключэннем. У 1946 годзе было створана першае ў СССР спецыялізаванае апёкавае аддзяленне на базе Інстытута хуткай дапамогі пад кіраўніцтвам прафесара Іўсціна Джанелідзэ. Так пачалася гісторыя новага напрамку ў айчыннай медыцыне. Праз два дзесяцігоддзі, у 1968 годзе, было адкрыта першае апёкавае аддзяленне на 40 ложкаў у Беларусі. Яно базіравалася ў хірургічнай клініцы 3-й гарадской клінічнай бальніцы. З часам аддзяленне вырасла ў Рэспубліканскі апёкавы цэнтр, які аказвае арганізацыйную, метадычную і практычную дапамогу медыкам розных лячэбных установаў. У 2018 годзе мы адсвяткавалі 70-годдзе апёкавай службы Рэспублікі Беларусь і 50-годдзе Рэспубліканскага апёкавага цэнтра.

***— Як у Беларусі стаць камбустыёлагам? Колькі ў нашай краіне спецыялістаў, якія працуюць у гэтай галіне медыцыны? У якіх установах аховы здароўя яны практыкуюць?***

— У 2005 годзе ўпершыню была ўведзена пасада ўрача-камбустыёлага-хірурга. Ён займаецца лячэннем апёкаў, ран іншага паходжання, якія патрабуюць пластычнага закрыцця, і іх наступстваў (кантрактур, дэфармацый, паталагічных рубцоў). Да гэтага моманту лячэннем такіх захворванняў займаліся хірургі і траўматолагі. Наша спецыяльнасць вельмі вузкая і нешматлікая, у краіне ўсяго толькі 50 урачоў-камбустыёлагаў-хірургаў. Усе яны працуюць у Рэспубліканскім апёкавым цэнтры і абласных апёкавых аддзяленнях.

Каб працаваць камбустыёлагам, трэба скончыць медыцынскі ўніверсітэт, стаць хірургам, прайсці перападрыхтоўку ці клінічную ардынатуру па спецыяльнасці «Камбустыялогія».

Аднак скажу вам адназначна, што ў нашай спецыяльнасці выпадковых спецыялістаў няма. Людзі альбо ўлюбляюцца ў сваю працу і застаюцца ў ёй на ўсё жыццё, альбо збягаюць у хуткім часе. Напэўна, як ніякая іншая хірургічная спецыяльнасць, камбустыялогія патрабуе максімальна чалавечнага, трапяткога стаўлення да пацыента, да кожнага сантыметра яго скуры. Такая дзейнасць накладае цяжкую фізічную і маральную нагрузку на кожнага медыцынскага работніка, які ўдзельнічае ў лячэнні апаленага чалавека.

> «Хацелася б, карыстаючыся выпадкам, звярнуцца да маладых бацькоў, бо малыя — асноўныя пацыенты нашага дзіцячага апёкавага аддзялення. Бацькі, не піце гарачую гарбату з дзіцем на руках, не пакідайце чайнік, кубак на краі стала або блізкіх канфорках кухонных пліт — гэта «лёгкая здабыча» кожнага дапытлівага малога. Дастаткова кубка гарачай кавы ці гарбаты, разлітых па неасцярожнасці на дзіця, каб малое атрымала апёкі да 50 % ад агульнай паверхні цела. Беражыце сябе і сваіх маленькіх дзетак».


Фота БЕЛТА.
Аляксей Часнойць з калегамі, Раманам Кагадоўскім і яго маці на ўручэнні ўзнагарод.

***— Колькі цяжкіх пацыентаў паступаюць у год з апёкамі ў бальніцы? Якога характару траўмы сустракаюцца часцей за ўсё?***

— Штогод з апёкамі ў медустановы звяртаецца каля 30 000 чалавек. Каля 6000 пацыентаў з іх праходзяць стацыянарнае лячэнне ў апёкавых аддзяленнях. Прыкладна 400 пацыентаў у сувязі з цяжарам атрыманай траўмы паступаюць у рэанімацыйныя аддзяленні. Без малога траціна з іх — дзеці. У дарослых найбольш часта сустракаюцца апёкі агнём і гарачымі вадкасцямі, у дзяцей (асабліва да пяці гадоў) — апёкі гарачымі вадкасцямі.

Асноўнымі прычынамі большасці апёкаў з'яўляюцца неасцярожнасць, глупства ці парушэнне элементарных правілаў бяспекі. Асабліва гэта датычыцца маленькіх дзяцей.

***— Вы ўваходзілі ў групу дактароў, якая лячыла цяжка пацярпелых падлеткаў Рому Кагадоўскага і Вадзіма Пальчанку. За працу некаторыя медыкі атрымалі дзяржаўныя ўзнагароды, вы, у прыватнасці, ордэн Францыска Скарыны. Раскажыце, чаму гэтыя гісторыі лячэння сталі прыкладамі асаблівага прафесіяналізму айчынных камбустыёлагаў?***

— Кожны выпадак цяжкай апёкавай траўмы патрабуе ад нас як ад прафесіяналаў сваёй справы поўнай аддачы. А калі размова ідзе аб лячэнні дзіцяці, ступень адказнасці ўзрастае ў разы. У сваёй практыцы штогод мы сутыкаемся з 3-4 выпадкамі цяжкай апёкавай траўмы ў дзяцей. Вядома, выпадак Рамана для нас быў унікальны не толькі з медыцынскага пункту гледжання, але і з маральнага, эмацыянальнага боку. Рэдкі выпадак, калі чалавек, тым больш дзіця, цаной свайго здароўя ратуе бліжняга. Такіх жа рашучых дзеянняў чакала ўся краіна ад нас. Вядома, мы кожны дзень прыкладаем усе намаганні па выратаванні жыццяў і здароўя пацыентаў незалежна ад ступені ўвагі да нашай службы. Але ў гэтым выпадку мы разумелі, што на коне стаіць «твар» не толькі нашай спецыяльнасці, але і медыцыны ў цэлым. У лячэнні і Рамана, і Вадзіма мы спрацавалі «на ўра» — прафесійна, зладжана, як адзінае цэлае. Высокія ўзнагароды з рук кіраўніка дзяржавы сталі знакам прызнання прафесіяналізму не толькі калектыву Рэспубліканскага апёкавага цэнтра, але і кожнага медыцынскага работніка, які прыняў удзел у лячэнні. Гэта падзея, бясспрэчна, знакавая для нашай службы.

***— Камбустыялогія — досыць маладая галіна медыцыны. Але, напэўна, некаторыя краіны маюць перадавы вопыт у гэтай сферы. Як вы можаце ацаніць узровень прафесіяналізму нашых камбустыёлагаў у параўнанні са спецыялістамі іншых краін?***

— Скажу вам шчыра, мне, як галоўнаму камбустыёлагу Міністэрства аховы здароўя і кіраўніку Рэспубліканскага апёкавага цэнтра, не сорамна ні за ўзровень развіцця нашай апёкавай службы, ні за прафесіяналізм сваіх калег, ні за аснашчэнне нашых апёкавых аддзяленняў. Пабываўшы на вядучых кангрэсах краін Еўропы і СНД, мы разумеем: нашы веды і ўменні не горшыя, а ў некаторых момантах нават лепшыя. Вядома, як любыя спецыялісты мы сутыкаемся з пытаннямі састарвання абсталявання і тэхналогій, але дзякуючы падтрымцы Міністэрства аховы здароўя гэтыя пытанні вырашаюцца своечасова. Цяпер ведамства праводзіць закупку найбольш сучаснага абсталявання для забеспячэння Рэспубліканскага апёкавага цэнтра. З гэтай мэтай набываюцца сучасныя дэрматомы на акумулятарах (апараты для збору непашкоджанай скуры пацыента для наступнай трансплантацыі), апараты вакуумнай тэрапіі ран, унікальны $CO_2$-лазер для лячэння пасляапёкавых рубцоў і дэфармацый, УГД — апарат экспертнага класа, хірургічны інструментарый для выканання рэканструктыўна-пластычных аперацый і расходныя матэрыялы для ўнікальнага гідрахірургічнага і ўльтрагукавога скальпеля, аналізатар газаў крыві і найбольш неабходнае абсталяванне для аддзялення рэанімацыі.

За апошнія гады спецыялістамі цэнтра ўкаранёныя ў практыку высокатэхналагічныя метады комплекснага лячэння пацыентаў з апёкамі скуранога покрыва і іх наступствамі з прымяненнем сучасных прынцыпаў актыўнай хірургічнай тактыкі, тэхналогій вакуумнага і ўльтрагукавога лячэння апёкавых ран. Урачамі-камбустыёлагамі-хірургамі асвоены ўсе віды высокатэхналагічных рэканструктыўна-пластычных аперацый у пацыентаў з пасляапёкавымі контрактурамі, дэфармацыямі і паталагічнымі рубцамі.

***— Якія перспектывы ў камбустыялагічнай службы Беларусі?***

— Што да перспектыў, то хацелася б адзначыць, што ўвесь калектыў апёкавай службы не стаіць на месцы, мы пастаянна вучымся, удасканальваемся, наведваем вядучыя навукова-практычныя канферэнцыі і кангрэсы па нашым напрамку, а потым укараняем новыя веды і тэхналогіі ў клінічную практыку. У нас ёсць адна вялікая мара, да якой ідзём. Сусветны досвед работы апёкавых цэнтраў сведчыць, што мэтазгодна размяшчаць апёкавыя аддзяленні ў асобным корпусе шматпрофільнага стацыянара. Сёння вядуцца работы па праектаванні асобнага корпуса Рэспубліканскага апёкавага цэнтра, які будзе адпавядаць усім сучасным сусветным стандартам для такіх установаў. Гэта дасць магчымасць рацыянальна размясціць службы цэнтра, больш эканомна расходаваць матэрыяльныя рэсурсы, больш эфектыўна каардынаваць работу медыцынскага і тэхнічнага персаналу, што ў канчатковым выніку павысіць якасць і рэзультатыўнасць аказання медыцынскай дапамогі. Вельмі спадзяёмся, што хутка наша мара спраўдзіцца.

***— Дайце нашым чытачам прафесійныя парады: што рабіць пры атрыманні апёку?***

— Напэўна, кожны чалавек хоць бы раз у жыцці сутыкаўся з апёкамі: выліваў на сябе гарбату ці каву, дакранаўся да гарачага праса ці каструлі. Здавалася б, нічога страшнага, і за тыдзень-другі ўсё загойвалася. Аднак так бывае не заўсёды. Часам апёкі не баляць і не выклікаюць асаблівага дыскамфорту. Прычынай адсутнасці болю можа з'яўляецца гібель нервовых канчаткаў, размешчаных у скуры. Гэта кажа нам пра глыбокае паражэнне, якое патрабуе ў большасці выпадкаў хірургічнага лячэння.

Мы, як ні дзіўна, заўсёды радуемся, калі апёкавыя раны балючыя. Гэта сведчыць аб павярхоўным пашкоджанні скуры, якая ў выпадку правільнага лячэння зажыве самастойна. Ацаніць плошчу і глыбіню апёкавых ран, прызначыць правільнае лячэнне можа толькі спецыяліст з досведам у дадзенай спецыяльнасці. Таму асноўная рэкамендацыя ад усяго нашага калектыву — своечасовы зварот па медыцынскую дапамогу. Бо часам невялікія па плошчы і глыбіні апёкавыя раны, асабліва ў дзяцей і пажылых, могуць прывесці да развіцця апёкавага шоку, інфекцыйных ускладненняў і нават смяротнага зыходу. Беражыце сябе, а ў выпадку атрымання апёкавай траўмы даверце сваё здароўе прафесіяналам.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

## Як даглядаць зігакактус («дзекабрыст»), каб ён цвіў кожны год



**Большасць пакаёвых раслін зімой знаходзіцца ў стане спакою, але кветка-зігакактус — шчаслівае выключэнне з правілаў. Часцей за ўсё расліна цвіце ў халодную пару года. За гэта яна і атрымала сваю назву, якая ў нашых шыротах стала нават больш папулярнай, чым біялагічная.**

— Існуе таксама некалькі іншых, менш распаўсюджаных, назваў кветкі. Сярод іх — «калядны кактус», «дзекабрына», «каляднік», «шлюмбергера». Дарэчы, на сваёй гістарычнай радзіме «дзекабрыст» лічаць раслінай — сімвалам Новага года.

Галоўная і самая дакладная прыкмета, звязаная з «дзекабрыстам»: па яго цвіценні можна адсочваць змены надвор'я. Так, з'яўленне бутонаў звычайна прадказвае хуткі надыход маразоў. Калі ж расліна раптам скінула бутоны, а ўмовы догляду не былі парушаны, то з высокай доляй верагоднасці можна сказаць, што за акном будзе пацяпленне.

### МЕСЦА І ГЛЕБА

Кветка аддае перавагу добра асветленым месцам або з лёгкім зацяненнем, але не любіць прамых сонечных прамянёў. У кватэры найлепшае месца для яго — усходняе (радзей паўночнае) акно.

Нейкіх асаблівых патрабаванняў да саставу глебы няма. Аднак дасведчаныя кветкаводы сцвярджаюць, што лепш за ўсё зігакактус расце ў грунце, які складаецца з сумесі для кактусаў, торфу, невялікай колькасці сфагнуму і такой жа — керамзіту, пяску і ліставога перагною. Дапушчальная кіслотнасць глебавай сумесі — рн 6,1—7,8, гэта значыць, ад слабакіслай да слабашчолачнай рэакцыі. Але лепш, каб гэты паказчык заставаўся ў межах нейтральных значэнняў.

Спецыялісты раяць адразу выбіраць для «дзекабрыста» строга вызначанае месца і ў наступным нікуды расліну не перастаўляць, паколькі гэта можа адбіцца на яе «самаадчуванні».

### ПАЛІЎ І ПАДКОРМКА

Зігакактус мае патрэбу ў сістэматычным паліве. Звычайна яго паліваюць пасля поўнага прасыхання глебы, у летні перыяд — раз на 3—5 дзён, увосень — раз на тыдзень. Прынята лічыць, што скарачэнне паліву напрыканцы лета дабратворна ўплывае на закладку раслінай кветкавых пупышак. Кветка не пераносіць пераліву, таму лепш увільгатняць яе ўмеранымі дозамі. Не пойдзе на карысць і апырскванне. А вось працерці лісце вільготнай сурвэткай ці змочанай і добра адціснутай губкай можна. Галоўная ўмова — вада павінна быць цёплая (25—28 °C), як і пры паліве.

Падкормліваць «дзекабрыст» варта комплексамі для кактусаў і сукулентаў.

У некаторых інструкцыях да ўгнаенняў могуць быць указаны не падкормкі па месяцах, а дасылкі да перыяду спакою. У раслін, якая цвітуць у лістападзе—лютым, такі перыяд надыходзіць пасля заканчэння цвіцення, гэта значыць, увесну, а не ў зімовы час, як у большасці раслін. У перыяд спакою кветку не ўгнойваюць на працягу месяца-двух. Сігналам да аднаўлення падкормак будзе з'яўленне ў расліны маладых лісточкаў.

### ХВАРОБЫ І ШКОДНІКІ

Пры выкананні ўсіх нормаў догляду інфекцыі зігакактус пашкоджваюць вельмі рэдка. Аднак часам расліну ўсё ж атакуюць шкоднікі і могуць развіцца грыбковыя хваробы. Вось самыя частыя з іх.

**Фузарыёз.** На лісці расліны, якое дэфармуецца, з'яўляюцца аранжавыя або светлыя сухія плямы. Пры працяглай хваробе лісце і карані адміраюць.

**Фітафтароз.** Лісце набывае цьмяны шэра-зялёны колер і пасля вяне. Сцёблы гніюць у раёне каранёвай шыйкі, а верхнія часткі расліны распадаюцца. Карані размякчаюцца і цямнеюць. З хваробай на яе ранніх стадыях можна справіцца, паліваючы глебу біяфунгіцыдамі.

Даты | Падзеі | Людзі

### 17 ЛІСТАПАДА

*Міжнародны дзень студэнтаў. Устаноўлены ў 1946 годзе на Сусветным кангрэсе студэнтаў, які адбыўся ў Празе, у памяць чэшскіх студэнтаў-патрыётаў, расстраляных нямецка-фашысцкімі акупантамі ў 1939 годзе.*

У краіне

**1870** год — нарадзіўся (г. п. Хоцімск) Сяргей Мікалаевіч Блажко, савецкі астраном, член-карэспандэнт АН СССР, заслужаны дзеяч навукі. У 1892 г. скончыў Маскоўскі ўніверсітэт, дзе працаваў з 1896 года (у 1920—1931 гадах — дырэктар астранамічнай абсерваторыі ўніверсітэта). Аўтар навуковых прац па астрафотаметрыі і астраноміі. Упершыню сфатаграфаваў і растлумачыў спектры метэораў (1904), упершыню ў Расіі даследаваў вышыні іх згарання. Адкрыў у кароткаперыядычных цэфеід пераменнасць перыяду і формы крывой бляску (эфект Блажко, 1907). Прапанаваў першую поўную тэорыю зацьменна-двайных зорак, новы метад выяўлення малых планет. Сканструяваў шэраг астранамічных прыбораў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

**1891** год — нарадзіўся Міхаіл Цімафеевіч Раманаў, адзін з кіраўнікоў абароны Магілёва, генерал-маёр. З 1918 года ў Чырвонай Арміі. Удзельнік грамадзянскай, савецка-фінскай войнаў (1939—1940). У гады Вялікай Айчыннай вайны на Заходнім фронце камандаваў 172-й стралковай дывізіяй, якая з атрадамі народнага апалчэння трымала кругавую абарону Магілёва. Цяжка паранены патрапіў у палон. У 1941 г. загінуў у канцэнтрацыйным лагеры.



У свеце

**1855** год — даследчык Афрыкі Дэвід Лівінгстан першым з еўрапейцаў убачыў вадаспад на рацэ Замбезі вышынёй 120 м. Ён называе яго імем каралевы Вікторыі.

**1901** год — нарадзіўся Іван Аляксандравіч Пыр'еў (1901—1968), савецкі кінарэжысёр, сцэнарыст. Народны артыст СССР. Зняў фільмы «Трактарысты», «Свінарка і пастух», «У шэсць гадзін вечара пасля вайны», «Кубанскія казакі» і іншыя.

**1933** год — ЗША заяўляюць аб прызнанні СССР і ўстанаўліваюць з ім гандлёвыя адносіны.

**1938** год — прымаецца Пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб арыштах, пракурорскім наглядзе і вядзенні следства»: скасаванне надзвычайных судовых троек. «СНК СССР і ЦК ВКП(б) адзначаюць, што за 1937—1938 гг. пад кіраўніцтвам партыі органы НКУС прарабілі вялікую работу па разгроме ворагаў народа і ачыстцы СССР ад шматлікіх шпіёнскіх, тэрарыстычных, дыверсійных і шкодніцкіх кадраў з трацкістаў, бухарынцаў, эсэраў, меншавікоў, буржуазных нацыяналістаў, белагвардзейцаў, кулакоў і крымінальнікаў, якія ўяўлялі з сябе сур'ёзную апору замежных разведак у СССР. Ачыстка краіны ад дыверсійных паўстанцкіх і шпіёнскіх кадраў адыграла сваю станоўчую ролю ў справе забеспячэння далейшых поспехаў сацыялістычнага будаўніцтва. Аднак не варта думаць, што на гэтым справа ачысткі СССР ад шпіёнаў, шкоднікаў, тэрарыстаў і дыверсантаў скончана...», адзначалася, у прыватнасці, у пастанове.

Так гаварыў...

**Канстанцін СІМАНАЎ:**

*«Адукаваны чалавек тым і адрозніваецца ад неадукаванага, што працягвае лічыць сваю адукацыю незавершанай».*



## Извещение о проведении 23 декабря 2021 года аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС»

| Сведения о продаваемом имуществе | | | |
|---|---|---|---|
| Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Сведения о земельном участке | Начальная цена, бел. руб., с учетом НДС | Размер задатка, бел. руб. |
| Капитальное строение с инвентарным номером 420/С-27097 общей площадью 89,3 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, Гончарский с/с, д. Селец, ул. Молодежная, 11А, наименование – магазин № 60, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности: пристройка (Б1/к), три склада (2, 3, 4), уборная (5), два забора (а, б) | площадь – 0,1052 га, кадастровый номер – 423682707164000024 | 7 680,00 | 768,00 |
| **Недвижимое имущество выставлено на торги по фактическому состоянию, рекомендуется осмотр** | | | |

**Продавец имущества:** ОАО «ДОРОРС», ул. Брестская, 77/1-2, 220099, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условия торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 (двух) процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» р/с BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 23.12.2021.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **23 декабря 2021 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 19.11.2021 по 21.12.2021** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (017) 240-62-06.

**Телефоны для справок:** (017) 360-42-22 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 240-62-06 (ОАО «ДОРОРС»). Дополнительная информация размещена на сайте www.mgcn.by в разделе «Недвижимость в собственность».


## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 8.41 | 17.08 | 8.27 |
| Віцебск | 8.36 | 16.52 | 8.16 |
| Магілёў | 8.31 | 16.58 | 8.27 |
| Гомель | 8.21 | 17.01 | 8.40 |
| Гродна | 8.55 | 17.24 | 8.29 |
| Брэст | 8.49 | 17.31 | 8.42 |

### Месяц

***Першая квадра 11 лістапада. Месяц у сузор'і Цяльца.***

### Імяніны

***Пр.*** *Аляксандра, Арсенія.*
***К.*** *Альжбеты, Валерыі, Саламеі, Валерыя, Здзіслава, Рыгора.*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




### УСМІХНЕМСЯ

**Ідэальны муж — які своечасова прыходзіць дадому, купляе прадукты, гатуе ежу, мые посуд, прыбірае кватэру, займаецца з дзецьмі...**
**Выснова: ідэальны муж — гэта жонка.**

Самы страшны кашмар: зрабіць бутэрброды, наліць гарбату, прынесці ўсё гэта ў пасцель, загарнуцца ў коўдру і забыцца пульт ад тэлевізара...

**Самы ўплывовы чалавек пасля свята — той, у каго фоткі...**



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2993.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 16 лістапада 2021 года.